№ 4 (3745)
15 студзеня 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

*На простор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СІТУАЦЫЯ

Адфутболена прапанова прадстаўнікоў шэрагу беларускіх палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў правесці ўсебаковае абмеркаванне плануемых паправак у выбарчае заканадаўства

Адпаведную заяву падпісалі і ў канцы снежня накіравалі ў Цэнтрвыбаркам прадстаўнікі Партыі БНФ, Беларускай партыі левых "Справядлівы свет", Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Беларускай партыі "Зялёныя", незарэгістраванай кампаніі "Гавары праўду!" і руху "За Свабоду". І атрымалі ў адказ ад варот паварот... Са спасылкай на заканадаўства.

"Праект нарматыўнага прававога акта можа быць вынесены на публічнае (усенароднае, грамадскае або прафесійнае) абмеркаванне па рашэнні дзяржаўнага органа або службовай асобы, упаўнаважанага прымаць (выдаваць) нарматыўныя прававыя акты", — сказана ў адказе Лідзіі Ярмошынай. На нармальную мову гэты адказ можна перакласці так: звяртайцеся да Аляксандра Лукашэнкі ці да дэпутатаў...

Таксама старшыня Цэнтрвыбаркама адмовілася ад правядзення незалежнай экспертызы паправак у Выбарчы кодэкс з боку БДІПЧ АБСЕ і Венецыянскай камісіі, матывуючы гэта тым, што падобныя экспертызы не прадугледжаны законам. Такі адказ таксама цалкам зразумелы: па ўзроўні і дарагоўлі аўтапарка ў чыноўнікаў мы гатовы раўняцца на Еўропу, а вось у стандартах правядзення выбараў — ні ў якім разе.

"Існуючая сістэма падліку галасоў накіравана на тое, каб было складана прадухіляць маніпуляцыі і фальсіфікацыі, — так пракаментаваў сітуацыю праваабаронца Валянцін Стэфановіч. — Працэдуры не прапісаны. Выбарчая камісія прыступае да падліку галасоў, а як яна гэта робіць, законам не агаворана. На практыцы гэта выглядае так: кожны член камісіі лічыць свой пачак бюлетэняў, і ўсё гэта адбываецца адначасова. Натуральна, назіральнік не можа зрабіць выснову пра вынік галасавання. Нават члену камісіі гэта невядома, паколькі ён ведае толькі тое, што палічыў ён. А як ён можа быць упэўнены, што іншыя лічаць сумленна, і тым больш старшыня камісіі, які штосьці падлічыў і ўпісаў у пратакол? Гэта вельмі зручная сістэма для фальсіфікацыі вынікаў галасавання, таму што працэдура закрытая, і ўлады не хочуць яе мяняць".

Усім зразумела, што за такую выбарчую сістэму беларускія ўлады будуць біцца як за апошні рубеж, за якім адступаць проста няма куды.

Ірына МАЛЬЦАВА.



ПАЗІЦЫЯ

Паздзекавалася...

Аб'яднаная грамадзянская партыя першапачаткова не падпісала зварот у Цэнтрвыбаркам і вельмі скептычна паставілася да чалабітнай, адрасаванай Лідзіі Ярмошынай. Чаму?

"Ні сама Лідзія Міхайлаўна, ні Цэнтрвыбаркам не прымаюць ніякіх самастойных рашэнняў, не валодаюць палітычнай ініцыятывай і не маюць належнага аўтарытэту ні ў Беларусі, ні за яе межамі. Ярмошына правяла ўжо некалькі выбарчых кампаній, прызнаных міжнароднай супольнасцю несправядлівымі. Атрыманы адказ, здзеклівы па сваёй сутнасці, — заканамерны вынік гэтай ініцыятывы", — так пракаментаваў вынікі перапіскі старшыня АГП Анатоль Лябедзька.

У ТЭМУ

Прадстаўнікі Партыі БНФ, руху "За свабоду" і кампаніі "Гавары праўду!" пацвердзілі інфармацыю пра тое, што пачалі кансультацыі па выпрацоўцы механізма вызначэння будучага саперніка Аляксандра Лукашэнкі на выбарах 2015 года. На дадзены момант абмяркоўваюцца тры прапановы. Выбары адзінага кандыдата апазіцыі праз Кангрэс дэмакратычных сіл (нагадаем, што так у 2006-м годзе быў вылучаны Аляксандр Мілінкевіч). Другая прапанова — правядзенне так званых праймерыз, папярэдняга рэйтынгавага галасавання па кандыдатурах, якія маюць намер удзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. Адпаведна, хто набярэ большы рэйтынг — той і стане адзіным. Трэцяя прапанова — байкот.

АКТУАЛІІ



Святлана КАЛІНКІНА

...Але Ярмошынай абы дзень пратрымацца

Здавалася б, чаго прасцей! Выйдзі і прапануй: *"Усе, хто беларускія выбары крытыкуе! Усе, хто вынікам нашых выбараў не давярае! Усе зацікаўленыя асобы! Давайце разам абмяркуем, якія змены трэба ўнесці ў Выбарчы кодэкс, каб надалей ні ў кога і ніколі не ўзнікалі сумневы ў тым, каго Цэнтрвыбаркам аб'явіць пераможцам".* Калі б нашы выбары былі на самай справе чэснымі, то менавіта так і зрабіла б Лідзія Ярмошына. Але ж не!

Трэба мець званне заслужанага юрыста Беларусі, каб знайсці адгаворку, чаму адзін з галоўных законаў краіны, які павінен гарантаваць асноўнае права грамадзян — самім выбіраць сабе ўладу, не патрабуе шырокага абмеркавання. Чаму змены ў ім павінны прымацца ціха і кулуарна. Але Лідзія Ярмошына сваёй кар'ерай ужо даказала, што і не на такое здольная.

Якая галоўная прэтэнзія да беларускіх выбараў?

Вельмі цяжка зразумець, адкуль бяруцца выніковыя лічбы. Праўда, многія ўжо здагадаліся, дзе і кім вырашаецца лёс кандыдатаў. Але якое гэта мае дачыненне да сапраўднага народнага волевыяўлення?

Так, сусветная паліталагічная навука сцвярджае, што ні ў адной краіне, ні ў адным грамадстве не бывае амаль адзінагалоснага галасавання. А мы раз за разам абвяргаем гэту навуку.

Эксперты, якія даследавалі выбары ў самых розных краінах, даказваюць, што нават тэарэтычна немагчыма з першага заходу выбраць адразу ўсіх 110 дэпутатаў. А беларусы насуперак навуцы менавіта так і "выбіраюць". Прычым, калі верыць афіцыйным вынікам, дружна галасуюць нават за тых, каго ў вочы ніколі не бачылі.

Нарэшце, ніякая навука не можа патлумачыць, у чым сэнс незалежнага назірання за падлікам галасоў, калі можна ўбачыць толькі спіны членаў выбарчых камісій, калі нават яны, лічыльшчыкі, у большасці выпадкаў не маюць уяўлення пра агульныя вынікі.

А фарміраванне камісій... Усё пад дыктоўку "вертыкалі".

Адмяніць такія выбары і не марнаваць грошай! Вось самая слушная прапанова, якую магла б агучыць старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, калі ўжо так ёй не хочацца зрабіць хоць што-небудзь для павышэння даверу людзей да беларускай улады.

Дарэчы, тут мы не будзем унікальнымі. Ёсць краіны, дзе ўсенародных выбараў наогул няма. Напрыклад, Кітай, на чый вопыт мы на словах раўняемся. Праўда, без усялякіх кансультацый з народам у Кітаі прынята рашэнне, што кожныя 10 гадоў кіраўніцтва краіны павінна быць зменена. І не ад таго, што кітайцы такія ўжо дурні. І не ад таго, што кіраўніцтву Кампартыі Кітая не хочацца захаваць свае пасады і палітычную вагу. Але ці мала каму і чаго хочацца, калі гісторыя даказала, што 10 гадоў на дзяржаўных вышынях — максімальны тэрмін. Далей чалавек губляе сувязь з рэчаіснасцю, сам робіцца рассаднікам карупцыі; краіна апынаецца ў яго ў закладніках, а ён — нават самы годны і таленавіты — перашкодай яе нармальнаму развіццю.

Кітайцы не дурні, яны з гісторыяй не спрачаюцца. Абавязковая змена ўсяго кіраўніцтва — прынцып, які не ставіцца пад сумнеў. Прыйшоў час — і сыходзяць нават самыя ўплывовыя персоны, тыя, чые імёны простыя людзі і вымавіць баяліся.

Больш за тое, зараз у Кітаі ўжо загаварылі пра неабходнасць палітычнай рэформы. Бо іначай краіну не ўтрымаць, "выбухне", як у свой час, здавалася б, ва ўсім зарэгламентаваны і запалоханы Савецкі Саюз.

Звычайна мы на кітайскі вопыт раўняемся, але калі размова заходзіць пра абавязковую змену ўлады — куды толькі знікае захапленне ўсім кітайскім?

Заплюшчыць вочы — і не бачыць ніякіх праблем. Вось які шлях абралі сённяшнія ўлады Беларусі. Не вераць людзі ў тое, што выбары ў Беларусі праходзяць чэсна, — ну і няхай не вераць.

Лідзія Ярмошына такія змены ў выбарчае заканадаўства падрыхтавала, што сістэма была "добрай", а "ўдасканаліцца" яшчэ болей. Напрыклад, прапаноўваецца, каб кандыдатаў маглі вылучаць не толькі палітычныя партыі, але таксама грамадскія арганізацыі, колькасць якіх складае тысячу чалавек і болей. Гэта значыць, "Белая Русь", напрыклад, ці БРСМ. Лянуюцца ўжо і да людзей схадзіць, подпісы сабраць.

Яшчэ адна прапанова — прадугледзець, што ў акруговых камісіях могуць быць члены з правам дарадчага голасу. Іншымі словамі, калі раней прадстаўнікі "няправільных" партый, што ў адзінкавых выпадках траплялі ў склад камісій, хоць нейкія пытанні маглі задаваць, то цяпер ім ужо слова не дадуць...

Ці павысіць гэта давер да вынікаў выбараў? Падаецца, што ў такім кантэксце нават само пытанне гучыць неяк дуркавата. Затое да сур'ёзнага палітычнага крызісу робіцца яшчэ адзін крок. Справа ў тым, што гісторыя не ведае ніводнага выпадку, калі б улада ў мэтах самазахавання магла бясконца падманаваць грамадства. І чым даўжэй такі перыяд зацягваецца — тым больш трагічны фінал. Гэта значыць, што стаім мы на шляху да бяды, да грамадскага выбуху, да сур'ёзных узрушэнняў. Але Ярмошынай абы дзень пратрымацца...

МАРЫ

Да канца года — 750—770 долараў

Мінскія ўлады назвалі новыя арыенціры сярэдняй заработнай платы ў сталіцы. У снежні 2013 года яна павінна дасягнуць 750—770 долараў у эквіваленце.

У лістападзе 2012 года мінчане ў сярэднім атрымлівалі 5 млн 448,5 тысячы (635 долараў). Так што ў 2013 годзе сярэднямесячная заработная плата ў параўнанні з 2012-м можа ўзрасці мінімум на 115 долараў. Але цікава, якімі да канца 2013-га будуць цэны. Студзень не перасягнуў і за палавіну, а ўжо падаражэлі некаторыя прадукты, садавіна, гародніна, санаторна-аздараўленчыя паслугі, квіткі на рэгіянальны чыгуначны транспарт і сувязь. Прычым паслугі сувязі адразу на 20%.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

РАЗЛІК

Год пікавых выплат

14 студзеня Беларусь ажыццявіла першы ў гэтым годзе плацеж па абавязку перад Міжнародным валютным фондам.

У адпаведнасці з графікам плацяжоў пагашаны абавязацельствы на 64,72 SDR (99,6 млн долараў па бягучым курсе). 23 студзеня афіцыйны Мінск павінен будзе вярнуць яшчэ 84,3 млн долараў. А ўсяго на працягу 2013 года наша краіна павінна пагасіць доўг перад МВФ (з улікам працэнтаў) на 1,63 млрд долараў, што з'яўляецца найбольшай сумай гадавых абавязацельстваў у рамках атрыманага ў перыяд са студзеня 2009-га па красавік 2010 года крэдыту stand by аб'ёмам 3,5 млрд долараў.

НАДВОР'Е

У сераду — адліга, у ноч з суботы на нядзелю — да -24

Гэты тыдзень будзе вылучацца ваганнямі тэмпературы. Ужо заўтра яна паднімецца прыкладна да нуля. Пройдзе снег, а месцамі — ледзяны дождж. Тэмпература паветра ўначы 0...-7, па поўначы да -10, днём ад -5 па поўначы да +3 па поўдні краіны.

Серада-чацвер абяцаюць галалёды і слізгату на дарогах.

— Да выхадных зіма зноў зменіць амплуа, — распавёў начальнік службы метэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра **Дзмітрый Рабаў**. — Уплыў на надвор'е акажа скандынаўскі антыцыклон, які зробіць Вадохрышча, як і належыць, марозным. У суботу-нядзелю 19—20 студзеня месцамі кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак -11...-18, ноччу пры праясненнях -19...-24, у паўднёва-ўсходніх раёнах ноччу і днём -6...-10.

ЭКСТРЭМАЛЫ

Патануў 38-гадовы дайвер

Як паведаміў начальнік Бярозаўскага раённага аддзела Следчага камітэта Аляксандр Панасевіч, няшчасны выпадак адбыўся ноччу на канале Бярозаўскай ДРЭС недалёка ад Белаазёрска. Двое мужчын прыехалі сюды з Брэста для заняткаў дайвінгам.

Пасля падводнага плавання адзін з аквалангістаў выйшаў на бераг і, не знайшоўшы там напарніка, нейкі час чакаў яго каля вадаёма. Потым беспаспяхова спрабаваў знайсці яго ў вадзе. Пасля таго як пошукі нічога не далі, пазваніў у міліцыю, паведамляе БелаПАН.

Цела загінуўшага пасля знайшлі. Папярэдняя прычына смерці — утапленне.

Чиновникам повысят зарплаты

Но сократят штаты

"У нас недопустимо низкая заработная плата у государственных служащих. Ну просто никакая зарплата!" — заявил в пятницу на совещании по вопросам оптимизации структуры, численности и функций госорганов Александр Лукашенко.

"У нас некоторые руководители предприятий, сидящие на дотациях, или же руководители, которые вообще лыка не вяжут, как в народе говорят, получают под 20 миллионов зарплату, еще и премию себе начисляют! А государственный служащий и половины того не имеет, тот, который работает. Поэтому недопустимо низкая зарплата", — возмущался А.Лукашенко.

При этом он подчеркнул, что повысить зарплату госслужащих можно, лишь оптимизировав численность штатов, которые, по его словам, можно сократить на четверть.

К СЛОВУ

Сколько сейчас зарабатывают чиновники?

Последние официальные данные о зарплатах в министерствах, которые публиковал Белстат, касались ноября. В декабре, безусловно, эти зарплаты были выше, потому что в последний месяц года работников обычно радуют премиями и другими надбавками. А в ноябре в некоторых министерствах страны рядовые сотрудники не зарабатывали и 500 долларов.

Орган госуправления	Средняя номинальная зарплата в млн рублей за ноябрь 2012 года
Белнефтехим	6,629
Белгоспищепром	5,588
Госстандарт	5,499
Нацбанк	5,302
Минэкономики	5,038
Минпром	4,902
Минэнерго	4,806
Минтранс	4,763
Минобразования	3,930
Минтруда	3,902
Минюст	3,742
Беллесбумпром	3,714
Минлесхоз	3,657
Мининформ	3,674
Минкульт	3,627

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

СЛЫШАЛИ?

Инвестиционный проект на «Камволе» заморожен

Проект строительства современного производства ОАО "Камволь" с участием турецкого инвестора заморожен на неопределенный срок, сообщила журналистам пресс-секретарь концерна "Беллегпром" Татьяна Пышкало.

"Проект по строительству нового современного производства с 4 млн погонных метров камвольных тканей в год на базе существующего минского "Камволя" остается актуальным", — сказала она.

По словам пресс-секретаря, в настоящее время "нет ни одного иностранного инвестора, заинтересованного в проекте". Информация об участии турецкого инвестора не подтверждается, сообщила Пышкало, поскольку в работе ОАО "Камволь" было многое пересмотрено, в частности, сейчас предприятие "будет своими силами отслеживать помещения с точки зрения строительно-архитектурных и монтажных работ", и до завершения этого процесса вопрос о реализации инвестиционного проекта не поднимается.

Напомним, на пресс-конференции 27 сентября 2012 года заместитель председателя концерна "Беллегпром" Людмила Тяглова сообщила, что турецкая компания решает вопросы финансирования проекта по строительству в Минске нового завода "Камволь". Но после визита на предприятие Александра Лукашенко, которое закончилось скандальными увольнениями директора комбината и руководителя концерна "Беллегпром" и его заместителя, турецкий инвестор отказался от реализации проекта.

Социальные показания для аборта свели до минимума

Из десяти позиций остались только две. Основание — постановление Совета министров от 11 января 2013 года № 23.

Теперь сделать аборт при наличии социальных показаний, который в Беларуси проводится в срок до 22 недель, можно женщинам, забеременевшим в результате изнасилования, и тем, кто решением суда лишен родительских прав.

Ранее в перечень социальных показаний для искусственного прерывания беременности помимо двух вышеупомянутых пунктов входили факт пребывания женщины или ее мужа в местах лишения свободы, наличие инвалидности I, II группы у мужа, наличие ребенка-инвалида с детства, смерть мужа во время беременности женщины, расторжение брака во время беременности, многодетность (наличие троих и более детей), признание женщины или ее мужа безработными во время беременности женщины, наличие у женщины статуса беженца.

ДЗІКУНСТВА

Жорстка збіў і закапаў

Ва ўпраўленні Следчага камітэта па Мінскай вобласці завершана расследаванне крымінальнай справы аб жорсткім забойстве школьніцы ў Стаўбцоўскім раёне, учыненым мінулым летам. Падрабязнасці гэтага забойства шакіруюць.

Цела вучаніцы 11-га класа Засульскай сярэдняй школы 1996 года нараджэння было знойдзена 30 чэрвеня ў двары дачнага дома ў вёсцы Засулле. Цела знаходзілася ў яме і было прысыпана зямлёй. З 28 чэрвеня школьніца знаходзілася ў вышуку як зніклая без вестак.

Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка УСК па Мінскай вобласці Таццяны Беланог, на целе дзяўчыны эксперты знайшлі мноства цялесных пашкоджанняў. Перад тым як пацярпелая памерла, яна падверглася жорсткаму збіванню.

Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў па падазрэнні ва ўчыненні злачынства быў затрыманы непаўналетні жыхар Стаўбцоўскага раёна, 1994 года нараджэння.

Са слоў затрыманага, ён з пацярпелай разам бавілі час у лясным масіве. Пасля ўзніклай сваркі, будучы ў стане алкагольнага ап'янення, ён збіў і задушыў дзяўчыну, пасля чаго яе труп закапаў.

Як зазначыла Беланог, у выніку расследавання па справе ў дачыненні да падазронага сабраны дастатковыя доказы яго вінаватасці ва ўчыненні злачынства і яму выстаўлены абвінавачанні на падставе п.6 ч.2 арт.139 КК (забойства, учыненае з асаблівай жорсткасцю).

Зараз матэрыялы крымінальнай справы УСК па Мінскай вобласці перададзены пракурору для накіроўвання ў суд.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

КРОПКІ НАД «і»

Не ў Клімавічах, а ў Кіраўску

працаваў з 2002-га па 2004 год Валерый Іваноў старшынёй райвыканкама.

Такім чынам выпраўляем недакладнасць, выпадкова дапушчаную ў падборцы "Кто пока не нашел общего языка с китайцами?", надрукаванай у мінулым нумары газеты.

Прыносім прабачэнні Валерыю Мікалаевічу і чытачам.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Правительство выкрутится, а народ?

Экономика Беларуси закончила 2012 год по нисходящей. Чтобы хоть как-то поправить грустную ситуацию с экономическими показателями, Белстат пошел на беспрецедентный шаг: принялся пересчитывать свои же данные по динамике ВВП. Надо думать, двухпроцентный рост ВВП вместо прогнозируемых 5—5,5% никак не устраивал правительство. Решили пересчитать почему-то данные за III квартал и вместо показанных ранее 1,9% роста вывели 3,1%. Как в том анекдоте: "Сколько будет дважды два?" — "А сколько вам надо?" Наверное, столько, чтобы удержалось правительство. А что же делать с другими показателями, более важными для экономики страны, чем рост ВВП? Например, с валютной выручкой и торговым балансом?

За 11 месяцев 2012 года валютная выручка Беларуси составила 46,7 млрд долларов. Это на 11,2% больше, чем за аналогичный период 2011 года. Но максимальное ее значение было достигнуто в мае месяце (5061,8 млн долларов). Затем выручка пошла на спад, который усилился с ликвидацией Россией известного "растворительного" бизнеса. Так, за ноябрь она составила лишь 3581,7 млн долларов, или на 14,9% меньше, чем за ноябрь 2011 года.

Испортили экспортные показатели и калийные удобрения. За январь—ноябрь по сравнению с аналогичным периодом 2011 года их экспорт снизился на 583,3 млн долларов. Настоящую свинью Беларуси подложил крупнейший игрок на рынке калийных удобрений канадская компания Canpotex, которая подписала контракт на поставку в Китай в первой половине 2013 года 1 млн тонн хлоркалия по цене 400 долларов за тонну, что существенно ниже предыдущей цены и цены, запрашиваемой в переговорах с китайцами Белорусской калийной компанией.

Если сальдо внешней торговли Беларуси товарами до августа прошлого года было положительным (своего пика оно достигло в марте — плюс 404,2 млн долларов), то к декабрю оно спикировало до минус 622,9 млн. Другими словами, к началу 2013 года страна вновь возвращается к временам хронического дефицита торгового баланса. Экспорт не только не диверсифицировался, но стал еще более однобоким в пользу тех же нефтепродуктов. Только одна контрабанда растворителей-разбавителей дала 2781,3 млн долларов выручки. Это больше, чем дали все калийные удобрения (2490,7 млн) или грузовые автомобили вместе с тракторами и седельными тягачами (2742,2 млн).

Как результат, только за декабрь золотовалютные резервы Нацбанка уменьшились на 263 млн долларов. Растет спрос на валюту со стороны физических и юридических лиц. Чистая покупка валюты населением в декабре составила 181,2 млн долларов, а в целом за 2012 год — 684,5 миллиона. В пунктах обмена валют не всегда имеются в наличии долларовые или евробанкноты. На бирже объемы ежедневных сделок с долларами в январе стали превышать 100 млн (4 января — 185 млн), тогда как в декабре среднедневные объемы были 50—70 млн долларов. Таким образом, стартовые позиции для удержания курса белорусского рубля в наступившем году явно неблагоприятные.

Инфляция по итогам прошедшего года составила 21,8% и уложилась в верхнюю вилку прогноза (22%). Опять-таки, если верить данным Белстата (интересно, сколько раз он ее пересчитывал?). Если цены на непродовольственные товары выросли на 10,3%, то продовольственные товары подорожали на 25,1%, а услуги рванули аж на 36,1%. Так, цены на лекарства выросли на 27,8%, на бензин — на 23,3%, одежду — на 10,6%. Алкоголь подорожал на 62,3%, мука — на 43,4%, хлеб — на 42,2%, мясо — на 17,4%. Санаторно-оздоровительные услуги подорожали на 89,6%, бытовые услуги — на 50,2%, техобслуживание жилья — на 42,9%, водоснабжение — на 41,9%.

Наступивший год — пиковый по выплатам по внешним заимствованиям. Поэтому перед белорусским руководством стоит задача любой ценой выбить из России максимальное количество нефти, которое возможно переработать на своих предприятиях. Задача частично решена: в I квартале Россия поставит одну четвертую часть из 23 млн тонн запрашиваемых объемов нефти на весь год. Для нее участие Беларуси в российских евразийских интеграционных проектах — важнее всего. Интеграционные гранты в виде дешевых нефти и газа — главные преференции, которые получают власти Беларуси. Это позволяет им обещать народу в наступившем году всяческие "коврижки". И рост ВВП на 8,5%, и увеличение экспорта товаров и услуг на 15,2%. В размере 4,5 млрд долларов к нам придут прямые иностранные инвестиции, и зарплаты улетят за 700 долларов. Но, как показывают реалии, запланированные в таких объемах иностранные инвестиции к нам никогда не приходят, а внутренних источников такого роста большинство независимых экспертов не видит. Более того, растущее отрицательное сальдо торгового баланса, как многие из них считают, вновь подорвет позиции белорусского рубля, который может свалиться в девальвацию по сценарию валютного кризиса 2011 года.

К этому есть и ряд других предпосылок. Нацбанк продолжает спонсировать государственные банки, постоянно выдавая им кредиты по возможно минимальным ставкам для поддержания их ликвидности. Хотя главный регулятор и делает это с оглядкой из опасения, что часть рублевой ликвидности может быть направлена на конвертацию в валюту. Но чем больше будет кредитная эмиссия, тем охотнее и увереннее будет дрейфовать белорусский рубль в сторону девальвации. Белорусский рынок труда, как и вся экономика, все глубже погружается в демографический кризис. Из 9,5 млн человек населения страны 5,8 млн — люди трудоспособного возраста. По некоторым оценкам, 2,5 млн трудоспособных белорусов не заняты в ее экономике. Они все более массово уезжают за рубеж, преимущественно в Россию. В основном жители малых и средних городов, молодые люди в возрасте 25—35 лет. Наибольшие кадровые потери несет строительство. Удержать людей может только рост зарплаты до хотя бы российского уровня, который белорусская экономика обеспечить не в состоянии.

Оценивая макроэкономические показатели, с которыми экономика Беларуси вступила в 2013 год, эксперты считают амбициозные планы правительства нереальными. С учетом беспрецедентно высоких платежей по внешним долгам этот год по меньшей мере, будет непростым. Власти вновь как-нибудь выкрутятся. В том числе используя политические факторы. Часть долгов рефинансируют с помощью российских банков, часть реструктуризируют, отодвинув сроки их погашения. Во всяком случае мы не ожидаем ни процветания, ни завалов. Для процветания нет ни предпосылок, ни источников. От завалов всегда будет нас охранять российская поддержка. Россия — гарант существования, сохранения и консервирования авторитарной экономики Беларуси. В свою очередь неизменная природа белорусской экономики — залог отсутствия прогресса в повышении жизненного уровня населения страны, все большего его отставания от соседних государств. В чем мы, господа-товарищи, сами и только сами виноваты.

ТАКАЯ ЖИЗНЬ

На социальных скидках можно сэкономить литр молока

Минские власти организовали для более чем 18 тысяч граждан, нуждающихся в социальной поддержке, скидки в магазинах и аптеках. Любопытно, сколько реально позволяет сэкономить эта акция и что может купить пенсионер или многодетная мать на сэкономленные деньги?

Из истории вопроса

Обслуживание через социальные дисконтные карты для граждан, нуждающихся в социальной поддержке, организовано относительно недавно. По указанной программе универмаги Минска предоставляют 10-процентную скидку на непродовольственные товары. На продовольственные товары скидка предоставляется в размере 5 процентов в 27 магазинах крупных розничных сетей. Адреса торговых точек можно найти на сайте Мингорисполкома.

Для получения скидок покупателю необходимо предъявить оригинал пенсионного удостоверения, удостоверение многодетной семьи или удостоверение инвалида.

Скидки предоставляются далеко не на все продукты питания. Например, мясо и рыбу пенсионеры и инвалиды покупают по такой же цене, как и все минчане. В списке продовольственных товаров отечественного и импортного производства присутствуют:

безалкогольные напитки,
минеральная вода,
кондитерские изделия,
чай, кофе,
майонезная и маргариновая продукция, спреды,
консервы мясные,
консервы плодоовощные общего назначения,
соки,
колбасные изделия (кроме вареных), копчености.

Что касается непродовольственных товаров, то скидки предусмотрены только на белорусские одежду и обувь. Конкретно со скидкой для нуждающихся предлагаются:

одежда верхняя мужская и женская (швейная и трикотажная), кроме изделий из натурального меха и кожи,
белье мужское и женское (швейное и трикотажное),
головные уборы мужские и женские, кроме изделий из натурального меха и кожи,
нулочно-носочные изделия мужские и женские,
обувь мужская и женская.

Небольшая экономия

Журналисты сайта "Завтра твоей страны" заглянули на днях в столичный магазин "Белмаркет" и подсмотрели продовольственный набор в корзинке у одной из покупательниц-пенсионерок:

макароны — 5820 руб.,
пельмени — 13.350 руб.,
яйцо куриное (10 шт.) — 11.190 руб.,
колбаса "докторская" в/с — (300 г) — 14.000 руб.,



гречка — 11.780 руб.,
сметана — 3780 руб.,
масло — 12.900 руб.,
чай — 11.040 руб.,
молоко — 7160 руб.,
хлеб 500 г — 4120 руб.,
батон 500 г — 5300 рублей.
Итого: 100.440 рублей.
Экономия: 3010 рублей.

Стоит ли ради трех тысяч рублей стоять в очередях?

— Я ни разу не пользовалась этой акцией, — говорит **Вероника Засимович**, мама четверых детей. — Я считаю, что не стоит тратить свое время ради трех тысяч.

До 10 января на 5 процентов были снижены цены на канцтовары в РУП "Белсоюзпечать".

тетрадь (48 листов) — 3700 руб.,
тетрадь (12 листов) — 850 руб.,
альбом для рисования — 15.600 руб.,
карандаш — 3300 руб.,
точилка — 3740 руб.,
ластик — 2950 руб.,
ручка шариковая — 5400 руб.,
ножницы — 17.470 руб.
Итого: 53.010 рублей.
Экономия: 2650 рублей.

Сэкономленных в аптеке денег на упаковку ваты не хватит

В аптеках Минска предоставляются скидки от 5 до 10 процентов для многодетных семей, пострадавших и ликвидаторов аварии на ЧАЭС, инвалидов и беременных женщин (при предоставлении соответствующих документов).

Во сколько обойдутся со скидкой аптекарские товары, которые являются самыми распространенными в домашней аптечке?

Аспирин — 950 руб.,
цитрамон — 2100 руб.,
парацетамол — 1550 руб.,
анальгин — 1100 руб.,
уголь активированный — 1600 руб.,
термометр ртутный — 13.450 руб.,
бинт марлевый стерильный — 4250 руб.,
вата (25 г) — 4650 рублей.
Итого: 20.750 рублей.
Экономия: 1450 рублей.

Получается, что за один поход за продуктами, канцтоварами и лекарствами льготные группы населения с помощью скидок могут сэкономить 7110 руб. На эти деньги можно четыре раза проехать в общественном столичном транспорте или купить один литр молока, или два килограмма картофеля, или три килограмма соли.

Игорь ЗАЛЕССКИЙ.

РЭПЛІКА

«Путем ходьбы на двух ногах»

10 студзеня суд Кастрычніцкага раёна г.Мінска прыгаварыў актывістаў кампаніі "Гавары праўду!" Святлану Волкаву да 5 сутак, Юрыя Фабішэўскага і Аляксея Марозава да 10 сутак арышту па артыкуле 23.4 (непадпарадкаванне міліцыі).

Гледзячы на Святлану, зусім яшчэ дзяўчынку, дый на Юрыя з Аляксеем, немагчыма было зразумець, як і ў чым яны маглі не падпарадкавацца мардаваротам, якія іх затрымалі. А тыя сведчылі: "Не падпарадкоўваліся!"

І ўспомніўся ўжо даволі даўні суд над маладафронтаўцамі, якіх затрымалі на святкаванні Дня Волі.

Сведчыў на судзе нейкі сяржант Рыбакоў. Затрыманы ім маладафронтавец пытае: "А куды ж, у які бок мы ішлі? Вы павінны гэта ведаць, бо вы кажаце, што мы з вамі стаялі "твар у твар"?" І беларускі міліцыянт крычыць у адказ: "Какой "твар"? "Какой твар"? У меня "лицо", а не "твар"! Не знаю я никакого "твара"!"

Я тады раптам падумаў, што не заўважаў раней, як яно блізка: твар і твор. На паверхні ляжыць, а не заўважаў.

Гэты сяржант Рыбакоў — твор без твару. Недаляпіў Гасподзь.

А далей — дыялог на судзе над Кацярынай Красновай.

Адвакат: За что вы задержали девушек?

Скрыганоўскі (баец спецназу): Они пытались прокрасться на каток.

Адвакат: Что значить "прокрасться"?

Скрыганоўскі: Не понимаю вопроса.

Адвакат: Каким образом они шли?

Скрыганоўскі: Каким-каким! Путем ходьбы на двух ногах!..

І Кацярына аказалася вінаватай.

Некалі ж усё гэта павінна скончыцца, сысці з нашага жыцця "путем ходьбы на двух ногах".

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ.

ДИСКУССИЯ

Игра в дурака

В газете "Народная Воля" от 4 января 2013 года опубликована статья за подписью г-на Анатолия Левковича — председателя оргкомитета по созданию Республиканского общественного объединения "Социал-демократы за диалог и консолидацию" — с предложением начать переговоры "между элитой и контрэлитой... для модернизации политической системы" государства. Или, как сказано, чтобы "Беларусь начала развиваться нормально, по-европейски".

Прежде всего г-н Левкович смело нарицает себя одним из основателей соцдемократии Беларуси. Боюсь прослыть наивным и доверчивым простофилей, но г-н Левкович никак ни по возрасту, ни собранием своих основополагающих мыслей не вписывается в длинную плеяду подлинных отцов-основателей белорусской социал-демократии. В этом можно убедиться, заглянув в энциклопедические статьи о рождении и расширении рядов этих строителей светлого будущего. Поэтому, г-н Левкович, для начала обозначьте канал, по которому плывет Ваша демократия, и определите, нет ли ответвлений от ее прямолинейного русла в ненужную сторону и с глупой тратой сил гребцов.

Г-н Левкович предлагает обильный поток политологической тарабарщины, который может унести нас к заплесневелым фундаментам недостроенных зрелых и развитых социализмов. Ну как, к примеру, мне, простолюдину, броситься в этот вихрь слов типа "накопление предпосылок трансформации общества"? Да не хочу я, г-н Левкович, пополнять кучи предлагаемых Вами предпосылок, потому что хорошо известные Ваши теоретики и практики в эти самые предпосылки укладывали штабелями своих врагов, недоразвитых и всяких деструктивных личностей.

Г-н Левкович явно собирается повторить путь Сусанина, который увел жаждущих в болото, либо превратиться в современного оракула, который недоуменно вопрошает у всех: "Братцы, что же за диво я построил в виде Беларуси? Как сие наречь и чему уподобить?" Ведь, судя по возрасту демократического опыта Левковича, он давно должен был победить все оттенки социалистов в Беларуси, объединить не за одним круглым столом все когорты демократов, давно усадить не за одним квадратным столом всех радетелей, чтобы к нынешнему дню не оказаться среди таких же маргиналов, выброшенных на периферию политического бытия.

Предложение г-на Левковича уныло простое — наладить переговоры с руководством страны для "переформатирования политического поля". И, что удивительно, оказывается, руководство уже созрело для этого, а вот радикальная оппозиция не способна на цивилизационный диалог из-за своего "бездумного" противостояния, "ультрареволюционной" фразеологии, "примитивного шапкозакидательства". Поэтому культурный диалог с властью поручается вести не радикальной оппозиции, а, естественно, ее "конструктивному" крылу в лице, конечно же, г-на Левковича. И все это громко называется "иной стратегией и новой политикой".

Если г-н Левкович ставит своей целью, как он выражается, "прорваться во власть" со своими сторонниками эволюционных перемен, то что же им мешает просто написать коллективное прошение о принятии на государственную службу и не морочить всем головы декларативными заявлениями от имени оппозиции?

Если г-н Левкович со своими конструктивными единомышленниками мечтает занять "достойное место в системном политическом процессе", то им ведь достаточно избраться на выборах всем списком в начальственные кабинеты и там конструировать круглые и квадратные столы с диалогами, строить свои предпосылки и по вертикали, и по горизонтали власти.

Если же г-н Левкович до сих пор не имеет ясности насчет самого себя и не может похвастаться действительно лидерскими качествами на своем многотрудном поприще социал-демократического строительства, тогда как можно довериться такому кормчему?

Зачем эта заунывная волынка о конструктивном диалоге с властью, которая до сих пор все силы прилагала к ликвидации любой организованной оппозиции; с властью, которая не терпит и не потерпит рядом с собой сплоченной альтернативы? А разве все "конструктивные и разумные силы" не ушли в эту власть, разве все "озабоченные судьбой страны" не украшают давным-давно президиумы той "элиты", которая давно нарекла своих противников "врагами народа и отморозками"?

Какие же еще конструктивные силы Вы, г-н Левкович, собираетесь найти в этих жалких кучках разрушителей и экстремистов? Какие же здоровые силы Вы намереваетесь отыскать среди остатков такого, с позволения сказать, костоломного переформатирования? Разве может быть позитивным результат переговоров "деградированных сектантов" с правящей элитой, которая погрязла в фальсификациях и систематическом надувательстве даже своего главного, стратегического союзника?

Поэтому спрашивается: почему же у нашего Сусанина столь узколобый прагматизм и зазнайство в плане перестройки политического поля, где, в который раз, по примеру и в угоду власти нет места радикалам? Все очень напоминает известную игру в дурака.

Евгений АНИЩЕНКО, гуманитарий.
Минск.

АДУКАЦЫЯ

Бухгалтары-плітачнікі і іншыя цуды беларускай адукацыі

Штогод беларускія студэнты і выкладчыкі сутыкаюцца з парушэннямі сваіх акадэмічных правоў — іх адлічаюць, звальняюць па палітычных матывах, прыдумваюць ім працоўныя павіннасці, навязваюць палітычныя погляды.

Сітуацыя не безнадзейная, упэўнены праваабаронцы і грамадскія актывісты. Тым больш што незахаванне нашых правоў можа вельмі балюча адбіцца на кішэні дзяржавы...

Працуй, студэнт!

Якой можа быць вытворчая практыка студэнта, які асвойвае спецыяльнасць бухгалтара? У Горках да гэтага пытання паставіліся творча. Студэнты, у тым ліку і будучыя бухгалтары, вымошчвалі тратуары пліткай! Так упарадкоўвалі горад перад "Дажынкамі". Чаму гэтая праца была прадстаўлена студэнтам як абавязковая практыка — пытанне іншае.

За 2012 год толькі згодна з афіцыйнай статыстыкай каля 30 тысяч студэнтаў былі задзейнічаны на сельскагаспадарчых працах. Кожны з гэтых маладых людзей мог паскардзіцца калі і не на сам факт адпрацоўкі, дык хаця б на мізэрны заробак. Напрыклад, на сельскагаспадарчых работых студэнты, што заняты з 09.00 да 18.00, атрымліваюць толькі 20 тысяч беларускіх рублёў за працадзень.

Сотні падобных выпадкаў, што мелі месца ў ВНУ па ўсёй краіне, знайшлі сваё адлюстраванне на старонках справаздачы аб маніторынгу парушэнняў акадэмічных свабод, што падрыхтавалі Грамадскі Балонскі камітэт, Цэнтр развіцця студэнцкіх ініцыятыў і камітэт "Салідарнасць".

Спецыялісты, што праводзілі маніторынг, прызнаюць: ён недасканалы і хутчэй з'яўляецца першым крокам на шляху да вялікага аналізу, чым грунтоўным "разбором палётаў". Між тым даследаванне ахапіла тры агульныя віды парушэнняў: прымус студэнтаў да датэрміновага галасавання, прыцягненне да работ і ціск на выкладчыкаў з боку дзяржаўных органаў і адміністрацыі ВНУ.

Удзельнікі маніторынгу збіралі скаргі з дапамогай назіральнікаў і шукалі неабходную інфармацыю праз СМІ. У выніку на 22 старонках змясцілася апісанне даволі прыкрай карціны, што вымалёвалася вакол нашых ВНУ.

Якасць каштуе грошай

Выпадкі, што ўвайшлі ў справаздачу па маніторынгу, — толькі самыя яскравыя сведчанні таго, што беларуская сістэма вышэйшай адукацыі перажывае глыбокі крызіс. Некалькі гадоў запар наша краіна намагалася ўключыцца ў Балонскі працэс, але выяўленыя парушэнні не даюць такой магчымасці. Беларуская вышэйшая школа проста не адпавядае міжнародным стандартам. Вельмі ганебна, калі ўлічыць, што ў Балонскі працэс увайшоў нават Казахстан, не кажучы пра Расію і Украіну.

"Існуюць міжнародныя крытэрыі маніторынгу якасці адукацыі, а ў нас іх не прымаюць, — выказаўся кіраўнік Грамадскага Балонскага камітэта **Уладзімір Дунаеў**. — *У нас свае ўласныя крытэрыі, створаныя Мінадукацыі. Пры гэтым праверкі на адпаведнасць гэтым нормам таксама праводзіць міністэрства. Пакуль якасць адукацыі будзе ацэньвацца па ўласных стандартах, выйсця з сітуацыі не будзе"*.

Адкуль упэўненасць, што на выніkі незалежнага маніторынгу звярнуць хоць якую-небудзь увагу? Справаздача па даследаванні трапіць у еўрапейскія камісіі. А гэта значыць, што ўступленне ў Балонскі працэс зноў зацягнецца. Што тут такога? Менш замежных студэнтаў прыедзе ў краіну, менш грошай атрымае бюджэт.

"Якасная адукацыя каштуе грошай, — працягвае разважаць Дунаеў. — *Кожны год складаецца спецыяльны спіс лепшых ВНУ свету. Галоўны крытэрый — колькі грошай выдаткоўвае ўстанова на выхаванне аднаго студэнта за год. Дык вось лідары ўкладваюць у аднаго студэнта ад 300 тысяч долараў да мільёна. У Беларусі — 1900 долараў. І гэта па ўсярэдненых даных, калі да аднаго значэння для ўсіх зведзены паказчыкі заробкаў і ўзроўні жыцця"*.

По афіцыйных даных, у 2010 годзе ў Беларусь прыехала на вучобу каля 10 тысяч замежных студэнтаў. А вось атрымліваць веды за межамі радзімы адправіліся 30 тысяч маладых людзей. Гэтыя факты яскрава сведчаць: беларуская адукацыя не карыстаецца папулярнасцю.

Каго лічыць пакрыўджаным?

Самым распаўсюджаным відам парушэння акадэмічных свабод, па выніках маніторынгу, стаў прымус да датэрміновага галасавання. Напярэдадні парламенцкіх выбараў назіральнікі змаглі заіфксаваць 25 масавых скаргаў, 21 з якіх пацвердзілася. Паведамленні прыходзілі і з цэнтральных ВНУ, і з рэгіянальных навучальных устаноў. Напрыклад, у Баранавіцкім дзяржаўным універсітэце назіральнік **Сяргей Гоўша** адзначыў: за тры дні на ўчастку прагаласаваў 801 чалавек, ці 31,6% ад усяго спісу. У асноўным датэрміновае волевыяўленне характэрна для навучэнцаў з бліжэйшага інтэрната.

"Мы размаўлялі са студэнтамі, яны пацвердзілі, што прагаласаваць датэрмінова ім загадалі куратары, у нас ёсць запіс на дыктафоне, дзе гучаць прозвішчы куратараў", — перадае Гоўша.

У пералік праблем і парушэнняў увайшлі і два дакладна зафіксаваныя выпадкі ціску на выкладчыкаў. Першы меў месца ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы. Дацэнта, выкладчыка гісторыі **Андрэя Чарнякевіча** звольнілі з-за кнігі "Гродназнаўства", сааўтарам якой ён быў. Па словах пацярпелага, у афіцыйных асоб узнікла шмат пытанняў да кнігі: яна заканчваецца 1990-мі гадамі, на вокладцы толькі бел-чырвона-белы сцяг, ды і выдадзена за межамі Беларусі.

Наступная ахвяра таксама працавала ў Гродзенскім універсітэце. **Ігар Кузьміноч** быў выкладчыкам на юрыдычным факультэце, але страціў месца пасля таго, як... павіншаваў з 15-годдзем грамадскую арганізацыю "Трэці сектар" на іх сайце.

Варта адзначыць, што паскардзіцца на парушэнне сваіх акадэмічных свабод можа кожны студэнт ці выкладчык. Трэба толькі запоўніць форму на сайце bolognaby.org. Нагодай для незадаволенасці могуць быць не толькі палітычныя пытанні. Студэнт можа паскардзіцца на якасць адукацыі ці на сістэму выкладання, калі лічыць, што яна ўшчамляе яго правы. Напрыклад, калі спецыяльнасць, азначаная як актуальная, заснавана на састарэлых ведах. Па кожным звароце будзе праведзена спецыяльная праверка, і, калі інфармацыя пацвердзіцца, даныя будуць прадстаўлены не толькі еўрапейскім камісіям, але і беларускаму Міністэрству адукацыі і адміністрацыі ВНУ.

Марыя МАЛЕВІЧ.

МНЕНИЕ

Нельзя уступать то, что давно отобрали

"Открытое письмо" А.Левковича в "Народной Воле" вызвало лично у меня недоумение. Где это он нашел у нас "радикальную оппозицию с ультрареволюционной фразеологией"? Назвал бы конкретные примеры, так нет же — общие словеса. Если он имеет в виду провокаторов, которых готовят сами спецслужбы, то при чем тут оппозиция?

Наша оппозиция последние почти 20 лет только и занимается тем, что просит власть соблюдать права человека. Кто у нас проводит выборы?

Не политические партии, не общественность, все схвачено вертикалью. Сколько раз предлагалось А.Лукашенко провести "круглый стол" и коллективно обсудить все спорные вопросы, но он на это не идет. А зря.

"Социал-демократ" А.Левкович предлагает пойти на уступки власти. Скажите, на какие? Реально ли людям уступать то, что у них давно отобрали? Признать результаты выборов легитимными? Как можно черное назвать белым?

В "Открытом письме" "конструктивист" Левкович фактически предлагает не рыпаться, а согласиться с тем, что власть "обувает людей в лапти". Я под такой болтовней, чем он давно занимается, никогда не подпишусь.

Алексей КОНОНОВИЧ, житель Бреста.

РУБАМ!

Хто ў большай пашане?

Прэзідэнцкая прэмія пераможцы міжнароднай алімпіяды ў два з лішнім разы меншая за мінімальную стыпендыю, якую прызначае Прэзідэнцкі спартыўны клуб перспектыўным маладым спартсменам.

Прычым прэмія ўручаецца аднаразова, а стыпендыя выплачваецца штомесяц на працягу года.

Нядаўна былі названы ўладальнікі прэзідэнцкай стыпендыі сярод адораных і здольных студэнтаў. У першым семестры 2012/2013 навучальнага года 191 студэнту і курсанту вышэйшых навучальных установ адукацыі прызначана стыпендыя ў памеры 675 тысяч беларускіх рублёў. Спецыяльнае распараджэнне падпісаў Аляксандр Лукашэнка. У ім, дарэчы, узгадваюцца і пераможцы міжнародных алімпіяд. Маладым людзям, якія не проста паказалі бліскучыя веды ў фізіцы, матэматыцы, біялогіі, геаграфіі, інфарматыцы на міжнародных алімпіядах, а сталі іх пераможцамі, прызначана грашовая прэмія. Яе памер — ад 4 да 5,5 мільёна рублёў.

У той жа час напярэдадні Новага года кіраўнік Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый Лукашэнка ўрачыста ўручыў пасведчанні аб прысуджэнні імяннной стыпендыі на 2013 год маладым перспектыўным спартсменам і іх трэнерам. Усяго адзначана 211 чалавек (спартсмены ва ўросце да 25 гадоў, трэнеры — да 40). Самы вялікі памер стыпендыі — 46 мільёнаў 800 тыс. рублёў (208 тарыфных ставак першага разраду). Штомесяц на працягу года яе будуць атрымліваць толькі тыя, хто заняў 1-е месца на дарослых чэмпіянатах свету. І трэба сказаць, што такіх маладых спартсменаў адзінкі. Але і мінімальны памер стыпендыі дастаткова высокі — 62 тарыфныя стаўкі першага разраду, што зараз складае 13 мільёнаў 950 тысяч рублёў. Такую стыпендыю прызначаюць маладому спартсмену за 4—8-е месцы на юнацкіх чэмпіянатах Еўропы і фінальных турнірах Кубкаў Еўропы. Пагадзіцеся, амаль 14 мільёнаў выглядаюць куды больш значна, чым 5,5 мільёна за перамогу на міжнароднай алімпіядзе па фізіцы ці біялогіі.

Дарэчы, вельмі сціплай грашовай узнагародай адзначаны і таленавітыя маладыя вучоныя краіны. Яны традыцыйна вызначаюцца па выніках сваёй працы за год, і ім прызначаецца прэзідэнцкая стыпендыя. У 2013 годзе яе будуць атрымліваць 94 таленавітыя маладыя вучоныя краіны. Памер стыпендыі — 2,5 мільёна рублёў у месяц.

Ці можна такую разбежку ў грашовым заахвочванні маладых талентаў розных сфер лічыць вынікам справядлівай палітыкі ўлад па падтрымцы таленавітай моладзі?

— *Гэта хутчэй рытуальныя дзеянні*, — лічыць метадолаг Уладзімір Мацкевіч. — *Мне здаецца, што і памер стыпендый вызначаецца чыста тэхнічна. Справа не ў перавазе спартсменаў над навукоўцамі. Хутчэй за ўсё, памер узнагароджання залежыць ад узроўню сярэдняга даходу ў гэтай сферы. Для навукоўцаў, якія сядзяць сёння на жабрацкіх заробках, дадатковы штомесячны дадатак у памеры 2,5 мільёна — добрыя грошы. Спартсмены ў Беларусі, прычым нават тыя, якія не ўдзельнічаюць у міжнародных спаборніцтвах, чэмпіянатах свету і Еўропы, знаходзяцца ў іншай маёмаснай нішы.*

Між іншым, трэба адзначыць, што кожны год колькасць спартсменаў і трэнераў, якім прызначаецца імянная стыпендыя, расце. Напрыклад, у параўнанні з 2012-м у 2013 годзе стыпендыю будуць атрымліваць на 29 чалавек болей.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.



Дзмітрый Лукашэнка ўручае пасведчанне аб атрыманні стыпендыі маладому фехтавальшчыку Арцёму Карабінскаму.

КАШАЛЁК

Попыт на валюту зноў узрос

У снежні перад навагоднімі святамі беларусы звычайна здаюць долары і еўра, каб набыць падарункі блізкім. У снежні 2012 года ўсё было наадварот.

Чыстая купля наяўнай і безнаяўнай валюты ў апошні месяц 2012 года склала 263,4 млн долараў, што амаль у 3 разы больш, чым у лістападзе.

Чыстая купля наяўнай валюты з боку насельніцтва ў снежні 2012 года склала 181,2 млн долараў супраць 51,9 млн у лістападзе 2012 года. Гэта ў 3 разы больш!

Акрамя таго, у снежні 2012 года насельніцтва купіла на чыстай аснове безнаяўнай валюты на 82,2 млн долараў (супраць 43,9 дол. у лістападзе).

У цэлым па выніках 2012 года чыстая купля насельніцтвам замежнай валюты склала 684,5 млн долараў. Наяўнай валюты было набыта на суму 163,6 млн долараў, безнаяўнай — на 848,2 млн долараў.

АМНІСТЫЯ-2012

Больш за 4 тысячы чалавек вызваліліся датэрмінова

Палітвязні пад амністыю не трапілі

У ходзе выканання амністыі вызвалена ад далейшага адбыцця пакарання з папраўчых установ закрытага тыпу больш за 3 тыс. чалавек, з папраўчых установ адкрытага тыпу — 1167 чалавек.

Адмоўлена ў амністыі 6,5 тысячы асуджаным. Пад амністыю не трапілі беларускія палітвязні, бо Закон аб амністыі не распаўсюджваўся на асоб, якія былі асуджаны за масавыя беспарадкі, за арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, паклёп у дачыненні да прэзідэнта, парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў.

РЭХА ТРАГЕДЫІ

Загадкавая драма на вуліцы Машыністаў

Жудасная і адначасова бязглуздая трагедыя адбылася ў беларускай сталіцы. Яна разыгралася ў прыватным сектары на вуліцы Машыністаў нібыта з-за сабакі, які, па словах некаторых мясцовых жыхароў, "кідаўся на людзей". А яго гаспадары, "прышлыя людзі", на скаргі не рэагавалі.

Але ці сабака прычына той драмы?

Аднойчы сабака не на таго нарваўся. У Мікалая П. была зброя, якую ён ужыў, каб уціхамірыць агрэсіўную і нявыхаваную жывёлу. Яе ўладальніца выклікала міліцыю. Сумны вынік, здавалася б, дробнага канфлікту: двое чалавек забіты, адзін паранены. Сабака аддзелаўся драпінай, якую замазалі зялёнкай.



Што ж там здарылася? Па версіі, агучанай Следчым камітэтам, 8 студзеня ў другой палове дня жанчына выклікала міліцыю па тэлефоне 102, паведаміўшы, што сусед страляе ў яе сабаку. На месца прыбылі двое міліцыянтаў, маёр і прапаршчык. Яны пачалі апытваць мужчыну 1953 года нараджэння, Мікалая П., на якога паказала ўладальніца сабакі. Падчас апытання Мікалай нібыта раптоўна адкрыў агонь на паражэнне. "Не вымаючы рукі са зброяй з кішэні", як той запраўскі гангстар ці каўбой, пісала пра яго дзяржаўная прэса.

Ад атрыманых ран 37-гадовы прапаршчык міліцыі Ігар Іванчык памёр. Маёр міліцыі змешчаны ў шпіталь з раненнем у сцягно. Мікалай П. скончыў жыццё самагубствам, стрэліўшы сабе ў галаву. Апроч таго, на яго целе былі знойдзены два раненні ў жывот, прычыненыя міліцыянтамі.

Калі б гаворка ішла пра злодзея-рэцыдывіста, якога затрымлівалі на блатной "маліне", гэтая гісторыя не выклікала б такога розгаласу. Але ж Мікалай П. ствараў уражанне добрапрыстойнага грамадзяніна. Раней не судзімы, непітушчы, што для гэтага раёна рэдкасць, гатовы прыйсці на дапамогу, бацька паспяховага сучаснага драматурга. Гаспадарлівы, калі меркаваць па выглядзе хаты. Усё жыццё працаваў слесарам у чыгуначным дэпо. У апошнія гады меў сваю невялікую справу, займаючыся прыватным аўтарамонтам. *"Скуру не драў,* — расказвае сусед. — *Сколькі дасі, то і добра. Звычайна прапаноўваў зрабіць за меншыя грошы, чым іншыя ў нас тут бяруць".*

У акрузе даволі шмат кропак аўтарамонту, на адной толькі вуліцы Машыністаў некалькі саматужных. Дарэчы, у інтэрнэце выказвалася меркаванне: ці не аўтарамонтны бізнес стаў сапраўднай прычынай канфлікту? Некалькі год таму Мікалая нехта моцна збіў, жонка знайшла яго без прытомнасці ў гаражы. Ён тады не прызнаўся, хто гэта зрабіў, нібыта баючыся яшчэ горшых наступстваў.

"Што за чалавек быў? Звычайны, як ты ці я", — сцісла характарызуе Мікалая сусед.

Работніца чыгункі, якая сядзіць у будачцы насупраць Мікалаевай хаты ўжо 11 гадоў, гаворыць, што ніколі не заўважала за ім нічога кепскага. Яна часта хадзіла да яго па яблыкі. Заўсёды, кажа, павітаецца, пагутарыць. "*Нейкі цэлы арсенал зброі ў яго як быццам знайшлі. Ну, гэта яны могуць..."* — выказвае яна асцярожны недавер афіцыйным звесткам.

Згодна з імі, у гаражы і хаце Мікалая П. знойдзены рэвальвер сістэмы "наган", абрэз паляўнічай стрэльбы, газавы рэвальвер, перароблены да стральбы баявымі патронамі, розныя боепрыпасы. Улічваючы, што Дзмітрый Канавалаў, які быў прызнаны вінаватым у тэрарызме і расстраляны ў сакавіку 2012 года, таксама працаваў слесарам, складаецца ўражанне, быццам беларускія слесары патэнцыйна небяспечная сацыяльная група...

Як і справа Дзмітрыя Канавалава, крывавая перастрэлка на вуліцы Машыністаў таксама выклікала шмат пытанняў і сумневаў. Якія матывы маглі падштурхнуць прыстойнага пажылога чалавека ў цвярозым розуме зарабляць сабе, магчыма, на вышэйшую меру пакарання, страляючы ў супрацоўнікаў праваахоўных органаў на паражэнне?

Жонка Мікалая П. магла б праліць святло на гэтую цьмяную справу, бо яна сваімі вачыма бачыла завязку драмы, але цяпер сваякі нябожчыка вырашылі маўчаць. "Не хачу вас, журналістаў, наогул бачыць", — чамусьці раззлавана адрэзаў сын Мікалая, той самы паспяховы сучасны драматург, калі я пастукаў у дзверы іх хаты. Але, зрэшты, адразу пасля крэмацыі мужа жонка тое-сёе расказала журналістам. Па яе словах, міліцыянты не проста "апытвалі" Мікалая, а заломвалі яму рукі, збівалі, хаця сам ён агрэсіі нібыта не праяўляў. Мужчына вырваўся, пабег да гаража, тады і пачалася страляніна. Хто, па кім і колькі страляў, гэтага жанчына ўжо не ведае, бо ад страху схавалася ў хаце. Але яна расказала, што ў гэты час з працы вярталася іх суседка і ўбачыла, што гараж Колі адкрыты і там шмат народу. *"Яна і зайшла ў гараж,* — распавяла жонка загінуўшага. — *Ён ляжыць, распрануты да пояса. У яго куля ў спіне, дзве кулі ў жываце, і ўвесь твар размажджэраны. Яна спытала: "Людзі, мілыя, што ж вы зрабілі з чалавекам?"*

Застаецца толькі гадаць, ці не магло быць так, што трагедыю справакавалі непрафесійныя дзеянні супрацоўнікаў міліцыі.

Бліжэйшая суседка Мікалая Надзея апісвае яго як чалавека "ганарлівага, самаўпэўненага, мужнага". На яе думку, з ягоным характарам ён мог "ускіпець", не вытрымаўшы грубага абыходжання міліцыянтаў з сабой. "*Пацярпеў бы ўжо,* — разважае жанчына. — *Яны ж з усімі так абыходзяцца, звычайная справа".*

"Некаторыя ў нас тут кажуць: маўляў, ну і правільна, што ён мянта забіў, — працягвае свае развагі Надзея. — *Хай бы і другога забіў, і трэцяга. Так ужо ненавідзяць іх, таму шкадуюць Мікалая. А я думаю: што такое міліцыянер? Форму апрануў і пайшоў на працу. Дома ж ён такі самы чалавек, як і мы. Не, калі Мікалай таго міліцыянта забіў, дык мне суседа тады не шкада. Толькі хто тут разбярэ, як яно было... Ведаеце, ён нібыта адчуваў, што памрэ. На Раство да суседкі зайшоў з шакаладкай, пасядзелі, пагутарылі. Так ён чалавек быў даволі замкнёны... І гэта трэба ж было такому на Раство здарыцца! Мы ж глядзім расійскую крымінальную хроніку па тэлебачанні, як у іх там, а тут тое ж самае пад бокам. Скажыце, ці даведаемся мы, што тут сапраўды здарылася?"*

Мне не было што адказаць на апошняе пытанне.

ЮБІЛЕЙ

Шчаслівая зорка Алы Саннікавай

Учора юбілей адсвяткавала Ала Уладзіміраўна Саннікава, маці экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Алегавіча Саннікава. Яна сустрэла 80-гадовы юбілей у атачэнні сваёй сям'і ў Лондане.

На долю гэтай жанчыны выпала нямала вострых драматычных момантаў, з якіх яна выходзіла пераможцай.

Ала Уладзіміраўна нарадзілася ў Віцебску ў 1933 годзе і насіла ў дзявоцтве прозвішча Кужалёва. У 1939-м пасля далучэння Заходняй Беларусі яе бацькоў накіравалі на працу ў Беласток. Бацька ўзначальваў прамысловасць, мама была намесніцай Гарадскога аддзела аховы здароўя. *"Раптам пачуліся выбухі, стрэлы,* — узгадвае дзяцінства Ала Саннікава. — *Мы падумалі, што гэта вучэнні. Аказалася, грымнула вайна. Быў дадзены загад, каб кіруючыя супрацоўнікі пакідалі горад апошнімі. Мама загадала нам з няняй паспець да адпраўлення машыны, якая везла дзяцей у эвакуацыю. Мы не паспелі, і нас не сталі чакаць. Потым высветлілася, што ў тую машыну па дарозе патрапіла бомба. Мама сказала: ты нарадзілася пад шчаслівай зоркай!"*

Потым мама Алы Уладзіміраўны з таварышамі трапіла ў Саратаў. Медыкаў хацелі накіраваць на фронт, і маці Алы далі загад адправіць дачку да родных або здаць у дзіцячы дом. Яна адмовілася: *"Хоць пад трыбунал пайду, але не аддамо!"* Тады яе як супрацоўніцу з добрай медыцынскай падрыхтоўкай накіравалі ў плывучы шпіталь.

Карабель плаваў па Волзе, падбіраў параненых, дактары з медсёстрамі ратавалі іх жыцці, а маленькая Ала пакутавала ў труме карабля ад марской хваробы. Так працягвалася да зімы. Потым жанчыну адправілі несці свой абавязак на бераг. Так разам з прыфрантавымі шпіталямі яна з дачушкай дайшла да Гродна, які вызвалілі ў 1944 годзе.

Там маці Алы Уладзіміраўны стала зноў працаваць у Гарадскім аддзеле аховы здароўя. Пасля Перамогі вярнуўся бацька, які потым працаваў па аднаўленні прамысловасці.

Ала Уладзіміраўна скончыла школу ў Гродне і паступіла ў 1950 годзе на філфак БДУ. З таго часу яна жыве ў Мінску. З Алегам Канстанцінавічам Саннікавым і яго артыстычнай сям'ёй яна пазнаёмілася падчас вучобы ў БДУ.

"*Мы з мужам Алегам Канстанцінавічам Саннікавым у першай групе выкладчыкаў універсітэта былі накіраваны на Кубу,* — гаворыць Ала Уладзіміраўна. — *На Кубе муж выкладаў гісторыю перакладу ў Інстытуце імя Пабла Лафарга, а я — рускую мову ў перыяд з 1962-га па 1964 год. Да нас прыязджалі Яўген Еўтушэнка, Расул Гамзатаў, Цімур Гайдар, які быў карэспандэнтам цэнтральнага друку.*

Дачку Ірыну (цяпер яна ўрач, жыве і працуе ў Вялікабрытаніі) мы пакінулі пад нагляд маіх бацькоў, а сына Андрэя даручылі дзеду Канстанціну Мікалаевічу і яго жонцы, народнай артыстцы Лідзіі Пятроўне Шынко.

Андрэй добра памятае свайго дзеда, яны моцна сябравалі. Праз тое, што адбылося з маім сынам Андрэем, незаслужаны цень быў кінуты і на дзеда, і яго справы сёння недаацэнены..."

Пасля вяртання з Кубы Алег Канстанцінавіч пэўны час працаваў у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ў Міністэрстве культуры, з 1975 года загадваў кафедрай Мінскага інстытута культуры. А Ала Уладзіміраўна працавала ў Дзяржаўным медінстытуце больш за 30 год на кафедры, якую заснавала з калегамі. Выкладала ўводзіны ў спецыяльнасць замежным студэнтам, спалучала медыцыну з мовазнаўствам.



Ала Саннікава з жонкай сына Ірынай Халіп.

Эла ДВІНСКАЯ.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Удалось ли Григорию Новику вернуть свой коттедж?

Несколько лет назад "Народная Воля" рассказывала про скандал с милицейскими дачами, которые находятся недалеко от Минского моря. Раньше там жили люди в погонах, которые занимали далеко не последние должности в силовых структурах. А потом эти дома у них по команде Лукашенко отобрали (за то, что они незаконно завладели замлей) и заселили туда многодетные семьи.

*Судя по публикациям в вашей газете, за свои дачи сотрудники МВД особенно и не боролись. Только бывший сотрудник Комитета госконтроля **Григорий Новик** пытался обжаловать это решение в различных, в том числе и высоких международных, инстанциях.*

Хочу спросить: так вернули ему дом или нет? Может, там уже никто не живет?

Игорь ПАШУК, Минск.

Экс-советник председателя Миноблисполкома, экс-начальник ДФР КГК по Минску и Минской области Григорий Новик на самом деле стучался в двери многих ведомств, чтобы вернуть дом, который он несколько лет строил вместе с сыном.

"Пусть я потрачу немало сил, средств и времени, но все равно добьюсь справедливости и докажу, что коттедж у меня отняли незаконно, — говорил Григорий Михайлович "Народной Воле". — *Я обратился в Комитет ООН по правам человека. Глава представительства ООН в Республике Беларусь **Антониус Брук** сообщил мне, что, как только Комитет рассмотрит мою жалобу, меня сразу об этом проинформируют. Я понимаю, что ответ может быть и нескорым, но надеюсь, что правда будет на моей стороне. Пока жив, буду добиваться справедливости в этом вопросе...".*

Однако, как известно, рассмотрение жалобы в ООН может растянуться не на один год.

Пока в детской деревне Исток" никакого перераспределения собственности не случилось. И в коттедже Григория Новика, как и в других домах, счастливо живут многодетные семьи.

"В этом смысле все у нас без изменений, — сказала "Народной Воле" директор ГУО "Детская деревня "Истоки" **Елена Воробьева**. — *В тех девяти бывших милицейских домах живут семьи".*

Елена Николаевна говорит, что одно время бывшие хозяева домов наведывались в деревеньку, в их числе был и Григорий Новик. Однако и его там довольно давно не было видно...

Марина КОКТЫШ.

ЛИЧНОЕ МНЕНИЕ

Президентские акты фактически отменили действие Конституции и законов

С интересом прочитал на страницах "Народной Воли" заметку Михася Спиридовича из г.п.Ивенец Воложинского района, где он "рубам" поставил вопрос перед белорусскими парламентариями: "Ці не настаў час пазбавіць прэзідэнта паўнамоцтваў на выданне дэкрэтаў?" ("НВ", 14 декабря 2012 г.).

Не знаю, найдутся ли депутаты, которые дадут читателю ответ на поставленный им вопрос. Тем более что время идет... Вот мое мнение на сей счет.

* * *

Считаю, что вопрос Михася Спиридовича заслуживает общественного внимания и требует серьезного обсуждения. Читатель затронул самое больное место в нашем законодательстве — декреты президента, которым новая редакция Конституции придала статус законов (ч.2 ст.85).

Сами по себе декреты — это необычное явление в юриспруденции. Да, такое было в советской истории, когда председатель Совета Народных Комиссаров РСФСР (глава правительства) В.И.Ульянов-Ленин издавал чрезвычайные правовые акты — декреты. Они имели прямое действие и не подлежали оспариванию. О содержании некоторых из ленинских декретов мы знаем из истории (например, декрете о суде, который в одночасье упразднил всю действующую судебную систему).

Зачем президенту понадобились такие грозные правовые акты, которые на деле умаляют, подменяют, отменяют законы? Ответ на этот вопрос очевиден: захват правового пространства, навязывание своей воли другим органам власти, должностным лицам, всем гражданам. В результате упраздняются принципы разделения властей, верховенства закона, уважения прав и свобод граждан.

По смыслу ч.2 ст.85 Конституции президент издает декреты "в случаях, предусмотренных Конституцией". Такие случаи оговариваются в статье 101 Конституции. В части 1 этой статьи говорится, что палаты парламента могут делегировать президенту законодательные полномочия на издание декретов, имеющих силу закона. Но такое делегирование "законодательных полномочий" может быть произведено лишь "по предложению президента", иметь определенный предмет регулирования и срок полномочий.

В то же время следует подчеркнуть, что, согласно ч.2 ст.101 Конституции, президент ни при каких обстоятельствах не может издавать декреты, которые предусматривают изменение и дополнение Конституции, ее толкование; изменение и дополнение программных законов; утверждение республиканского бюджета и отчета о его исполнении; изменение порядка выборов президента и парламента; ограничение конституционных прав и свобод.

А что происходит на практике? Сколько мы знаем декретов, которые изменяют и дополняют Конституцию (например, декрет №14 от 26 июня 2008 г. "О некоторых мерах по совершенствованию деятельности Конституционного суда Республики Беларусь")? Еще больше декретов, которые посягают на права и свободы граждан. Последний из них — декрет №9 от 7 декабря 2012 г. "О дополнительных мерах по развитию деревообрабатывающей промышленности" *(о его противоречии положениям Конституции и международным договорным обязательствам Республики Беларусь подробно написал известный юрист и правозащитник Гарри Погоняйло. См.: "Сыр в мышеловке, или Крепостничество в XXI веке" // "Народная Воля", 21 декабря 2012 г.).*

Согласно ч.3 ст.101 Конституции, президент вправе издавать временные декреты "в силу особой необходимости". Это он может делать как по собственной инициативе, так и по предложению правительства. Временные декреты должны быть в трехдневный срок представлены для последующего рассмотрения в палаты парламента. Эти декреты сохраняют силу, если они не отменены 2/3 голосов от полного состава каждой из палат.

Получается, что до последнего времени президент, не испросив согласия у парламента на издание постоянных декретов, издает временные декреты. После их утверждения палатами парламента они приобретают как бы постоянный характер. Если ранее во временных декретах содержалось хоть какое-то обоснование "особой необходимости" их издания, то в последующем об этом ничего не говорится (в том числе в декрете №9).

По сути, президент издает декреты по своему усмотрению, по любым вопросам государственной жизни, невзирая ни на Конституцию, ни на законы. Они не подлежат контролю со стороны других государственных органов, в том числе органов, обязанных следить за соблюдением Конституции. С ноября 1996 года не отмечено ни одного случая постановки перед Конституционным судом вопроса о проверке указов и декретов президента на предмет их конституционности.

В результате сохраняется видимость законности. И Конституционный суд в своих посланиях о состоянии конституционной законности в стране не замечает никаких "изъянов" в законодательстве и практике его применения.

На самом деле картина в этой сфере далеко не радужная. По сути, президентские акты, включая директивы, отменили действие Конституции и законов и стали настоящим законодательством Республики Беларусь.

Встает все тот же вопрос: что делать? Ответ так же известен: лишить президента права издавать декреты как акты чрезвычайного характера, которые приводят к единовластию.

Михаил ПАСТУХОВ, доктор юридических наук, профессор.

ЗАПАВЕТНАЕ

Праз усё жыццё нясу гэты дар

...Не дае сапакою, здавалася б, неверагоднае: магілёўская дзяўчынка Ялінка Салаўёва — адзіная на ўвесь абласны цэнтр з 400-тысячным насельніцтвам вучаніца адзінага беларускамоўнага класа! Кіраўнік гарадской арганізацыі ГА "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Магілёва Алег Дзьячкоў лічыць галоўнай прычынай такога катастрафічнага становішча тое, што бацькі баяцца: у беларускамоўных дзяцей не будзе ніякіх перспектыў...

Але я цалкам згодна з Пятром Кернажыцкім ("НВ" №№171—172 за мінулы год), што гэта зусім не так. Тым больш што беларускамоўныя школьнікі авалодваюць, як правіла, і рускай мовай не горш за іншых сваіх равеснікаў, якія, на жаль, пазбаўлены такога багацця, як мова родная.

Магу расказаць сваю асабістую гісторыю. Я вучылася ў Бярэзінскай беларускамоўнай школе №1, скончыла яе ў 1953 годзе з сярэбраным медалём. Усе прадметы, у тым ліку матэматыку, фізіку, хімію, біялогію, геаграфію вывучала па-беларуску. А паехала паступаць у Ленінградскі ўніверсітэт імя А.Жданава. З намі, медалістамі, пры паступленні праводзілі не экзамены, а гутаркі. Помню, адказваючы на пытанні членаў камісіі, я ўжывала зрэдку тэрміны, назвы, асобныя словы на беларускі лад. Мяне ўважліва слухалі, з маёй дапамогай перакладалі словы на рускую мову. І я не разгубілася, не адчувала сябе няёмка, трымалася ўпэўнена, таму што веды, набытыя мной у беларускамоўнай школе, былі не горшымі, чым у іншых, хто са мной трымаў гутарку пры паступленні.

Усе экзамены ўжо за першае паўгоддзе на першым курсе, у тым ліку матэматыку і фізіку, я здала на "выдатна", мой фотапартрэт быў змешчаны на Дошцы гонару факультэта... Я і далей вучылася старанна, мне было вельмі цікава, перада мной былі адчынены дзверы бібліятэк, музеяў, тэатраў аднаго з найлепшых гарадоў свету. На факультэце існавала студэнцкае навуковае таварыства, і мяне абралі яго старшынёй.

Скончыла ўніверсітэт, атрымаўшы дыплом з адзнакай. На працу па жаданні паехала ў Казахстан. Трапіла ў Карагандзінскую геолага-здымачную пошуковую экспедыцыю на пасаду старшага калектара, потым працавала геолагам, начальнікам геалагічных партый і атрадаў. Завочна вучылася ў аспірантуры Геалагічнага інстытута АН СССР, у 1972 годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю. І нідзе мне матчына мова не замінала. 20 доўгіх гадоў я была далёка ад Беларусі, не чула роднага слова. А каб не забыцца яго, выпісвала ў Караганду часопіс "Беларусь", чытала, часта ўслых, для свайго мужа — рускага па нацыянальнасці.

Па Беларусі я сумавала. Успамінала сярод казахстанскіх стэпаў нашы лясы, рэкі, азёры, родную Бярэзіншчыну. Праца там была цікавай. Мяне цанілі, адзначалі, паважалі. Там я стала сапраўдным спецыялістам любімай справы. Там нарадзіла сына. І ўсё ж пры ўспамінах аб родных мясцінах магла і слёз не стрымаць...

Неспадзявана, бы пасланая мне Богам, адбылася сустрэча з беларускім акадэмікам, выдатным геолагам, апантаным любоўю да Беларусі, але разлучаным з ёю не па сваёй волі на 37 гадоў — Гаўрылам Іванавічам Гарэцкім. У маі 1969 года я была запрошана ў Маскву на Міжнародны калёквіум па геалогіі і фаўне Еўропы, старшынёй якога быў Г.Гарэцкі. Ад свайго кіраўніка, прафесара К.Нікіфаравай (я была тады аспіранткай Геалагічнага інстытута АН СССР) я даведалася пра цяжкі лёс Гаўрылы Іванавіча, рэпрэсаванага як "вораг народа", пра яго выдатныя заслугі ў геалагічных даследаваннях. Калі слухала выступленні самога Гаўрылы Іванавіча на калёквіуме, назірала, як паважліва звяртаюцца да яго вядомыя еўрапейскія свяцілы, вельмі ганарылася, што ён наш, беларус, і што я таксама беларуска... І здарыўся шчаслівы, нават нечаканы момант, калі яшчэ адзін наш зямляк, прафесар Даніла Іванавіч Пагуляеў, сябра Гаўрылы Гарэцкага з часоў маладосці, неяк у перапынку паміж лекцыямі падвёў мяне да Гаўрылы Іванавіча, пазнаёміў. Той паглядзеў на мяне з цікавасцю і запытаўся па-беларуску, якое ў мяне прозвішча. "Зінава", — адказала я. "А дзявочае?" — "Сярмяжка..." — "Прыгожае, тыпова беларускае. А вы чамусьці змянілі яго..." Я задумалася: і праўду ж кажа. З тых пор лічу сябе Зінавай-Сярмяжка...

Гаўрыла Іванавіч распытваў пра маю працу ў Казахстане, пра вучобу ў аспірантуры, пра сям'ю, бацькоў, а потым параіў: "Абараняйце дысертацыю ды вяртайцеся на радзіму, працуйце на Беларусь!"

Так і зрабіла. Абараніўшы дысертацыю ў 1973-м, прайшла па конкурсе на пасаду старшага навуковага супрацоўніка ў Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР. Працавала ў лабараторыі агульнай і рэгіянальнай тэктонікі, якую ўзначальваў не хто іншы, як сын Гаўрылы Іванавіча акадэмік Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі. Потым трапіла ў лабараторыю пад кіраўніцтвам самога Гаўрылы Гарэцкага. Вось пашанцавала дык пашанцавала! Разам з ім у адным пакоі сядзелі некалькі супрацоўнікаў, і ў мяне была магчымасць увачавідкі назіраць, як працуе Гаўрыла Іванавіч, як размаўляе з людзьмі, праводзіць пасяджэнні, які ён уважлівы і добразычлівы да ўсіх. Вучылася ў яго. Асаблівае ўражанне рабіла яго прыгожая беларуская мова, і я ўспаміналa, успамінала мову майго дзяцінства, пачала размаўляць на ёй. Не ўсё спачатку атрымлівалася, але Настаўнік верыў у мяне...

Я шмат чытала беларускай літаратуры — мастацкай і навуковай, пісала артыкулы і даклады. Мне вельмі дапамагаў Гаўрыла Іванавіч, якому я застануся ўдзячнай назаўжды. І для мяне, і для ўсіх яго вучняў і паплечнікаў ён — прыклад аддана насці і любові да сваёй Радзімы, яе зямлі, мовы і культуры.

...Калі працавала ўжо настаўніцай геаграфіі ў мінскай школе, то выкладала свой прадмет па-беларуску. Праўда, на пачатку навучальнага года не ўсе вучні былі настроены на гэта. Я нікому не перашкаджала вывучаць яе на рускай мове. Але што цікава: неяк неўпрыкмет праз некаторы час усе вучні пераходзілі на беларускую мову, і атрымоўвалася цудоўна! Нашы дзеці ў большасці сваёй вельмі здольныя, сярод іх няма ла таленавітых, і родная мова ім толькі на карысць, яны становяцца духоўна багацейшымі. Я ў гэтым упэўнена.

Але што зрабіла наша Міністэрства адукацыі пазней? Падручнікі 9-х класаў па геаграфіі і гісторыі Беларусі былі перакладзены на рускую мову. Гэтае рашэнне, апрача шкоды, нічога іншага не прынесла. Гэта безумоўна памылковае рашэнне — у шэрагу іншых, што навязваліся і навязваюцца апошнімі гадамі нашым дзеткам і педагогам. Прывяло гэта да сумных вынікаў. Беларускую мову ў школе разанулі так, што далей няма куды. А яе ж трэба вывучаць у поўным аб'ёме і размаўляць на ёй не толькі на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Беларус павінен не саромецца (як бывае), а ганарыцца сваёй беларускасцю і перш за ўсё сваёй прыгожай мовай. Чула, як некаторыя называлі яе грубай, але тое тычыцца не сапраўднага спеўнага беларускага слова, а пачварнай трасянкі.

Шкада тых, хто губляе нешта вельмі дарагое і каштоўнае. Беларусам час вяртацца да ўсяго роднага. А вывучаць іншыя мовы свая мова ніяк не замінае. Вывучайце, калі ласка, узбагачайцеся ўсебаковымі ведамі на карысць роднай Беларусі. Але без свайго — вы проста не зусім паўнавартасны чалавек.

Роза Адамаўна ЗІНАВА-СЯРМЯЖКА, кандыдат геолага-мінералагічных навук.

Мінск.

САЛІДАРНАСЦЬ

Давайце зробім дзеткам свята!

"На жаль, бацькі Крысціны Шацікавай дагэтуль не змаглі аформіць апякунства над яе дзеткамі — Ягорам і Мікіткам... З-за розных бюракратычных правалочак... І ўжо трэці месяц не могуць атрымаць грашовыя выплаты на хлопчыкаў. А гэта азначае, што і падарункаў на Новы год у хлопчыкаў таксама не будзе. А гэта — першы Новы год без матулі... Я разумею, што ні Мікіта, ні Ягорка не вераць больш ні ў Дзеда Мароза, ні ў цуд, але ж хацелася б зрабіць для іх маленькае свята. Таму, калі ў кагосьці ёсць магчымасць, дашліце хаця б невялічкія сумы Крысціным бацькам на адрас: 212002 г.Магілёў, Пушкінскі праспект, д.63, кв.207, Шацікавай Святлане Міхайлаўне".

Такі ліст даслала сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Кацярына Ткачэнка.

Нагадаем, што Крысціны Шацікавай — яркай, маладой, прыгожай актывісткі з Магілёва — не стала пару месяцаў таму. Рак. Медыкі не здолелі выратаваць. Засталіся двое сыноў. Давайце ім дапаможам, каб у хлопцаў была вера калі не ў цуд, то ў людзей.

НУ И НУ!

На каком это языке?

Здравствуйте!

На днях был в Чечерске, заглянул в местный историко-этнографический музей. Это было нечто! Такого количества ошибок на русском и белорусском я не видел уже давно.

Вот небольшая часть запомнившихся:
— "арудзія труда",
— "кузнечная печ",
— "делали в кузнеце",
— "немцы шли на пролом",
— "бойцы стояли на смерть"...

И подобного этому там полно.

Про многочисленные ошибки (их десятки, если не сотни) я сказал работникам, но в ответ услышал, что большинство посетителей смотрят экспонаты, а не читают пояснения к ним. В конце концов мне все же пояснили, что прежний директор музея была украинкой и толком не знала ни русского, ни белорусского языков.

Как рассказали мои знакомые, работникам музея давно говорили про ошибки, но ничего не меняется. А в музей регулярно приводят школьников, которые вместе с учителями видят неграмотное написание и приучаются к тому, что неграмотность — это норма...

Помогите навести порядок.

Андрей СОКОЛОВСКИЙ.

Минск.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

Праз паўвека нават дзед Знацьме «мову» не як след

Тэлеканал "Беларусь-2" паказаў фільм пра аднаго са стваральнікаў амерыканскай касмічнай індустрыі, нашага славутага земляка 102-гадовага Барыса Кіта і ўсю ягоную беларускую гамонку прадубляваў у перакладзе на рускую мову.

*А час ляціць — страла нібыта...
І ў рэшце рэшт прыйшла пара,
Калі зямляк наш знакаміты
Не век пражыў, а паўтара!
Не трэба тут давацца дзіву —
То сокі роднае зямлі!
Рашыў наведаць ён Радзіму,
Дзе дні юнацкія прайшлі.
Яшчэ спускаўся ён па трапе,
А ўжо насустрач бег народ.
Адразу ж у абдымкі трапіў,
Затым — нібыта ў калаўрот:
Прамовы, гутаркі, сустрэчы...
А потым нейкі чын ці пан
Падумаў: "А было б дарэчы,
Каб паказаў тэлеэкран.
Усе равеснікі старога
Даўно ўжо адышлі ў нябыт,
А ён — як падарунак Бога,
Той самы легендарны Кіт!
Натхнёны прыкладам ягоным,
Саспее кожны для рыўка,
І адчувацьмуць людзі гонар
За беларуса-земляка..."
...На мове матчынай з экрана
Гучаў Барыса маналог.
Аднак жа скмеціў нечакана
(Здзіўлення Кіт стрымаць не мог),
Што словы нейкая кабета
Перакладае на "язык".
— Навошта вы рабілі гэта?
— Народ ад "мовы" ўжо адвык, —
Кіту сказала маладзіца,
Калі сышоў праграмы час. —
І хоць вы можаце дзівіцца,
Аднак забылі "мову" ў нас.
— Не веру! — Кіт сказаў кабеце.—
Забылі ў горадзе, але
На "мове" і дзяды, і дзеці
Гамоняць звыкла на сяле.
Дык ці жыве ў народзе "мова"?
Няўжо ў яе трагічны лёс?
Пераканацца канчаткова
Рашыў у вёсачцы, дзе рос.
Ужо калі ў аўтамабілі
Ён ехаў да народных мас,
У вёску з Мінска пазванілі,
Далі настаўнікам наказ:
— Вы будзьце там напагатове
І падрыхтуйцеся як след:
Заўжды на беларускай мове
Вядзе бяседы гэты дзед.
Дык вы там абнавіце веды,
І вучняў трэба "падцягнуць",
Каб разумелі дзеці дзеда
І самі "мовілі" чуць-чуць.
Званок неспадзяваны гэты
Для ўсіх, як кажуць, не ў руку:
Здаўна ўжо ў школе ўсе прадметы
Засвойваюць на "языку".
Тым больш што з вучнямі і дома
Не "размаўляюць" іх бацькі,
Бо тую "мову" пакрыёма
Парвала ўлада на шматкі.
Дый для настаўніка любога
У "мове" ўжо бар'ер узнік:
У інстытутах педагогам
У клёк трамбуецца "язык".
Дык што рабіць? Няўцям жа будзе,
Пра што расказвацьме зямляк:
Зусім не знаюць "мову" людзі...
Без перакладчыка — ніяк.
Хто ж можа з "мовы" перакласці?
І хтось згадаў:
— У вёсцы ў нас
Ёсць знаўца "мовы" (во дзе шчасце!) —
Зусім нямоглы дзед Панас.
Ён калісь чуў хаця б "трасянку"
Ці ад бацькоў, ці ад людзей.
Калі нальём старому шклянку,
Ён нам як след перакладзе.
...Душа яго, Кіта Барыса,
Шчымела, як і век назад,
Калі знаёмыя абрысы
У вочы кінуў далягляд.
Ён пахадзіў крыху наўкола,
Агледзеў родны краявід,
А потым педагогі, школа,
Пачаў расказваць дзецям Кіт.
Ды толькі нейкі фон нязвычны:
Сядзіць дзядок сівы ў кутку
І паўтарае словы зычна,
Але чамусь на "языку".
Ягоны голас болей гучны,
Ледзь не ўзбіваецца на крык.
Не на Кіта — на дзеда вучні
Глядзяць, "хапаюць за язык".
— А хто ты будзеш? — госць замежны
На дзеда скіраваў пагляд.
— Раблю я для дзяцей належны
Тваёй гаворкі пераклад...
— Дык вось у чым, выходзіць, справа...
Усё адкрылася Кіту:
Такая ж сумная выява,
Як у сталіцы, ёсць і тут...
На дзеда зыркнуў Кіт сурова:
— Язык твой — быццам бервяно:
Перакладаць, дык слова ў слова,
А не як ты — цераз адно.
Тут "мова" грызлася, як рэпа,
У школу я хадзіў калі.
А ты, падобна, недарэка —
Па "мове" меў адны "калы"!
— Ды не рабі ты крыку-енку, —
Апраўдваўся стары Панас, —
Бо я ж ужо пры Лукашэнку
Пайшоў калісьці ў першы клас...*

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Лёс Тачылы вырашыць Лукашэнка?

Яшчэ 18 чэрвеня крымінальная справа былога старшыні Полацкага гарвыканкама Уладзіміра Тачылы была накіравана ў Генпракуратуру для перадачы ў суд. І больш па гэтай справе не было нічога чуваць. Быў судовы працэс ці не? Калі так, то чым скончыўся?

Г.АДАМОВІЧ, Віцебская вобласць.

Былога кіраўніка Полацка пакуль не судзілі. Як паведаміў днямі начальнік аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю Генпракуратуры **Пётр Кісялёў**, Уладзімір Тачыла напісаў прашэнне аб памілаванні на імя кіраўніка краіны. І зараз, мяркуючы па ўсім, яго лёс будзе вырашаць не суд, а Аляксандр Лукашэнка.

Нагадаем, што чыноўнік абвінавачваецца ў тым, што ў 2009 годзе ён незаконна выдзеліў для сябе і сваіх блізкіх зямельныя ўчасткі ў Полацку ў зоне ахоўнага ландшафту, на тэрыторыі, прылеглай да Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра.

Разам з Тачылам па гэтай справе праходзяць яго колішні намеснік Сяргей Куксаў, экс-старшыня Полацкага райвыканкама Валерый Палідавец са сваім намеснікам Алегам Ермаковічам. Яшчэ падчас следства шкода ад незаконнай дзейнасці была пакрыта ў поўным аб'ёме.

СТОП-КАДР



ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Спакуса

Пачатак верасня быў такі халодны, што Кацярына Іванаўна мусіла прапаліць нанач печку. Калі вуголле перагарэла, яна зачыніла заслонку і замкнула ў калідоры дзверы. Не паспела адысці, як з надворнага боку нехта моцна пастукаў.

— Можна да вас на агеньчык, Кацярына Іванаўна? — пачуўся бадзёры голас Антона Зінчука. Ён быў прадпрымальнікам, меў прадуктовыя магазіны не толькі ў іхнім мястэчку Смолічы, але і па ўсёй ваколіцы. Мінулую зіму, вясну і частку лета Кацярына Іванаўна Кірзенка, былая настаўніца матэматыкі, рыхтавала да паступлення яго сына Андрэя. Хлопец паступіў ва ўніверсітэт, бацька заплаціў ёй за рэпетытарства. Што ж прывяло яго сюды ў даволі позні вячэрні час? Спачатку думала не адчыняць, але і адправіць неяк няёмка.

— Заходзьце, калі ласка, — прапусціла яна госця.

— Я ненадоўга, — пераступаючы парог, прамовіў Зінчук. — Сёння быў у Мінску, наведаў сына. Ён такі шчаслівы, што ажыццявіў сваю мару і паступіў вучыцца. А з ім шчаслівы і я. Вось што падумаў, Кацярына Іванаўна... Тых грошай, што я вам даў за рэпетытарства, мала, бо папрацавалі на славу. Яшчэ прывёз прэміяльныя... — Ён дастаў з кішэні курткі пульхны канверт і паклаў на стол. — Тут тры мільёны. Вазьміце ў знак удзячнасці.

— Не трэба! — запратэставала яна. — Вы ж мне заплацілі.

— Кажу — прэміяльныя. Не адмаўляйцеся. Я ведаю, якая ў вас, настаўніцы, была зарплата і якую пенсію зарабілі. Бярыце, лішнія не будуць.

Антон Зінчук развітаўся і пайшоў, а Кацярына Іванаўна ўжо прыкідвала, на што патраціць гэтыя тры мільёны. І сапраўды, пры яе пенсіі гэта скарб.

— Дачцэ аддам, Вікторы. У іх з мужам дзве дачкі, адна ўжо вучыцца ва ўніверсітэце. І сыну трэба дапамагчы. Зіма неўзабаве, а ў яго зімовай гумы на аўтамабільных колах няма. І сабе што-небудзь куплю. Хоць раз у жыцці парадую душу. Словам, усім па мільёне.

Як вырашыла, так і зрабіла. І дачка, і сын абрадаваліся нечаканым грашам. Ды і хто не абрадаваўся б!

Сабе Кацярына Іванаўна вырашыла купіць што-небудзь з парфумы.

Аднойчы раніцай села на электрычку і праз гадзіну была ўжо ў Мінску. Яна ведала, што на праспекце Незалежнасці ёсць магазін "Звезда", дзе прадаюць імпартную парфуму. Хмурым восеньскім днём там гарэла прыемнае мяккае святло. Нясмела пераступіла парог і апынулася ў царстве чароўных пахаў. Мілая дзяўчына-прадавец падышла да яе і спытала:

— Можа, вам што-небудзь падказаць?

— Ой, я зараз пагляджу. У вас тут так прыгожа...

— Паглядзіце, — гасцінна дазволіла тая, відаць, не вельмі спадзеючыся, што гэтая кабета з правінцыі (а сталічныя людзі хутка пазнаюць правінцыялаў) тут можа нешта купіць. Не для правінцыялаў цэны.

Кацярына Іванаўна хадзіла ля вітрын і любавалася прыгожымі бутэлечкамі. Раптам вочы наткнуліся на адну з іх, невялікую па памерах.

— "Шанэль нумар пяць"... — прашапталі вусны.

Божа, як яна хацела мець такія духі, як марыла, калі яшчэ была студэнткай! І потым гэта мара не пакідала. Але ці да таго было? Муж любіў выпіць і памёр у маладым узросце. Адной трэба было гадаваць дзяцей, даць ім адукацыю, дапамагчы ўладкавацца ў жыцці. І толькі калі, так бы мовіць, яны сталі на ногі, успомніла пра сябе. Як пайшла на пенсію, то яшчэ дазволілі два гады папрацаваць. Тады купіла сабе ўборы, зрабіла рамонт у кватэры. А цяпер таксама не сядзіць без справы, займаецца рэпетытарствам. Заробленае аддае дзецям, ды і частку пенсіі аддае. А тут нечаканыя грошы з'явіліся. "Можна што і для сябе..." — разважала яна, стоячы для запаветнай вітрыны.

— Дайце мне, калі ласка, "Шанэль нумар пяць", меншы флакон.

— Васямсот шэсцьдзясят тысяч рублёў, — прадавец, мабыць, не паверыла сваім вушам.

— Добра, я заплачу.

— Дам вам дысконтную карту і зможаце набываць у нас тавары са скідкай, а як будзе ў вас дзень нараджэння, прыедзеце з пашпартам і выберацe сабе любы тавар з дваццаціпрацэнтнай скідкай.

Дзяўчына запісала яе даныя, падала карту і запаветную парфуму, выказала добрыя пажаданні.

Кацярына Іванаўна была амаль шчаслівая, але, калі пакінула царства прыемных пахаў, настрой яе змяніўся. Прычым вельмі рэзка, як мяняецца восенню надвор'е: толькі што свяціла сонца і раптам хлынуў халодны дождж.

— Ну што я нарабіла, старая дурніца?! Спакусілася на імпартныя духі... Нікому ўжо не патрэбна ні без духоў, ні з духамі. Як пахвалюся суседкам, на што патраціла амаль мільён рублёў? Скажуць: звар'яцела на старасці гадоў. І праўду скажуць. Лепш аддала б гэтыя грошы дачцэ ці сыну або пароўну падзяліла б. А колькі прадуктаў можна было за іх купіць! — дакарала сябе ледзь не са злосцю. Потым прыходзіла іншая думка: — А што я добрага бачыла ў жыцці? Толькі працавала і працавала. І ў школе, і гаспадарку ўласную трымала. Ну і што, калі патрацілася...

З сумненнямі яна прыехала дадому і вырашыла:

— Каб не перажываць ды не думаць, аддам духі дачцэ. У яе хутка юбілей. Яна маладая, ёй больш патрэбна...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

ВОПРОС—ОТВЕТ

Как избежать встречи со змеей в собственном огороде?

Уважаемая редакция "Народной Воли"!

Я постоянная читательница Вашей газеты. Вы всегда объективны, правдивы, в "Народной Воле" всегда можно найти полезную информацию. Может, и мне подскажете рецепт... как избавиться от змей, в том числе и ужей.

Я пенсионерка и на лето уезжаю в деревню Приборово Ивацевичского района. Там родительский дом. Небольшой лес, рядом река Щара. Все бы хорошо, да вот уже второй год нашествие ужей и других змей. Правда, ужи нас теперь не пугают, они кусаются, но не ядовитые. А вот гадюк боимся. На летние каникулы приезжают внуки, а они бегают всюду, и мы очень боимся за их здоровье и жизнь. Эта живность по всей деревне ползает. Если раньше мы с радостью ехали в деревню, то теперь — с опаской и страхом. Не подскажете, как избавиться от ядовитых змей, есть ли какие способы их отпугнуть, уничтожить? Люди пожилые не помнят, чтоб по деревне змеи ползали. Раньше они жили в лесах, на болотах, а теперь понравилось жить в деревенских сараях.

Вера Николаевна ПАХОТИНА.

Брест.

Специалисты говорят, что избавиться от змей на приусадебном участке значительно легче, чем, например, от мышей. Причем с гадюками проще, чем с ужами, потому что ужи сильнее привязаны к сырым местам вроде подпола — это они чаще всего живут под домами или по соседству в сараях.

Чтобы не было гадюк, надо в первую очередь убрать с участка весь "сушняк": ликвидировать все кучи веток или дров, пожечь на золу все бревна и нагромождения старых досок, а нужные доски поставить стоймя в сарае или перенести на чердак. Обязательно следует собирать осенью и весной граблями всю опавшую листву, чтобы не было "лесной подстилки": если ее не будет, гадюки сюда из леса на охоту не поползут, они охотятся только там, где можно быстро спрятаться. Выкашивайте перед осенью бурьян, чтобы он не превращался к весне в сухостой.

Кроме того, стоит осмотреть весь участок и протяпать трещины в земле, чтобы там нельзя было прятаться. Любые нагромождения стройматериалов нежелательны. Не будет укрытий — не будет и змей. На таком участке змеям делать нечего, оно вообще сторонятся мест, где присутствуют люди, потому что им не нравится "топание" (у змей чуткое восприятие сотрясения земли, они "читают" колебания земли как книгу, поэтому не любят шума, не любят простукивания их убежища; в природе их самый страшный враг — копытные). Да и в лесу полезно создать "пограничную зону": обойдите окрестный лес и унесите на сжигание все кучи хвороста. Для гадюк излюбленное место — это когда лесники чистят лес и сваливают сухостой и вырубленный кустарник в кучи и так оставляют их. Если их оставить, то змеи станут там размножаться, и, естественно, рано или поздно им станет тесно — и они начнут расселяться к вам.

Есть несколько народных средств, как вывести змей с участка.

1.Можно попробовать повесить на участке китайские колокольчики. Змей этот звук будет отпугивать, а вас звон колокольчиков раздражать не будет.

2.Можно рассыпать на участке сухую горчицу. Ее запах отпугивает змей. На 10 соток земли достаточно 1 кг горчицы. Можно посадить большое количество чеснока, запах которого также змеям неприятен.

3.Обнесите участок забором на кирпичном цоколе. Высота кладки должна быть не менее 40—50 сантиметров. Это хорошая преграда от непрошеных гостей.

4.Приготовьте керосиновый раствор. Разведите горючую жидкость водой 1:2 и опрыскайте участок вдоль забора. Змеи не переносят этот запах.

5.Принесите из леса ежиков, ведь они ловят змей. Поставьте им блюдца с едой и молоком.

6.Купите вибрационные устройства против кротов. Так вы и змей, и кротов отпугнете.

З ПІСЬМА

Падтрымліваю першы варыянт

Прачытаў, што ўжо гатовы законапраект аб канфіскацыі аўто ў п'яных кіроўцаў. Генпракуратура настойвае на тым, каб забіраць аўто адразу, як высветліцца, што вадзіцель нападпітку. Але раней распрацоўшчыкі законапраекта выступалі за тое, каб канфіскоўваць машыну толькі ў выпадках, калі з-за нецвярозага вадзіцеля гінуць людзі альбо атрымліваюць цяжкія цялесныя пашкоджанні. А калі чалавека паўторна затрымалі ў нецвярозым выглядзе, пазбаўляць яго волі на тэрмін да двух гадоў. Мне падаецца, што такі варыянт больш справядлівы і разумны.

А.КАНОНЧЫК.

Мінск.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
15 СТУДЗЕНЯ 2013 г.

ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ

Президента Чехии выберут в конце января

В первом туре президентских выборов в Чехии наибольшее количество голосов набрали экс-премьер Милош Земан и нынешний министр иностранных дел страны Карел Шварценберг.

За Земана отдали свои голоса свыше 24% избирателей, за Шварценберга около 23%. Оба лидера президентской гонки в Чехии — люди пожилые: Милошу Земану 68 лет, Карелу Шварценбергу — 75.

Всего в первом туре приняло участие 9 кандидатов в президенты.

Впервые в истории Чехии глава государства избирается прямым голосованием, ранее президента выбирал парламент.

Многолюдный “Марш против подлецов”

Воскресное шествие с требованием отмены “антимагнитского закона” и роспуска Госдумы в Москве собрало, вопреки ожиданиям скептиков, десятки тысяч человек.

Участники “Марша против подлецов” заполнили всю проезжую часть Петровского, Рождественского и примыкающих бульваров — шествие растянулось по крайней мере на полтора километра. Его участники протестовали против закона, который в ответ на санкции против предполагаемых российских коррупционеров со стороны США запрещает, в частности, усыновление российских сирот американцами.

Крупнейший религиозный праздник мира стартовал в Индии

Миллионы индийских паломников начали стекаться в индийский город Аллахабад в преддверии обряда Кумбха-мела, проходящего раз в 12 лет. В понедельник тысячи людей приступили к омовению в точке пересечения рек Ганг и Ямуна. Еще 10 млн человек, как ожидается, совершат его в ближайшие дни.

В ходе Кумбха-мелы 2001 года в главном дне омовения приняли участие 40 миллионов паломников, что сделало это событие самым многолюдным в истории человечества. В январе-феврале текущего года город Аллахабад, как ожидается, посетят более 100 млн человек.

В Казахстане средний палец, показанный VIP-кортежу, оценили в 5 суток ареста

Инцидент произошел в Павлодаре — 22-летний мужчина показал “неприличный жест кортежу в виде среднего пальца левой руки”. По неофициальным данным, в кортеже находись высокопоставленные приезжие из Астаны.

Беспилотник пятого поколения

Taranis — новейший беспилотный разведчик-штурмовик пятого поколения, рассчитанный на выполнение межконтинентальных полетов. Максимальная скорость — сверхзвук.

Уникальность Taranis состоит в том, что, в отличие от других использующихся в настоящее время беспилотных летательных аппаратов, он не требует постоянного контроля со стороны оператора. Самолет способен самостоятельно маневрировать, выполнять разнообразные операции, в частности, принимать решения об уничтожении атакующих его ракет. Запрос человеку Taranis делает только при выходе на цель — уничтожать ли?

Евросоюз предоставит Египту 5 млрд евро

Эти средства предоставляются для поддержания процесса перехода к демократии, сообщает 13 января Reuters со ссылкой на заявление председателя Европейского совета Хермана Ван Ромпея, сделанное во время визита в Каир. Он также призвал власти Египта довести до конца переговоры с Международным валютным фондом о предоставлении займа еще в 3,6 млрд евро. За последние два года Египет уже потратил более 15 млрд евро на поддержание государственной валюты.

СТОП-КАДР



Былы прэм’ер Італіі Сільвіа Берлусконі ў добрым настроі зноў рыхтуецца да выбараў…

Без візы

З пачатку гэтага года грамадзянам Польшчы не патрэбна віза ў Арменію. Улады гэтай краіны адмянілі візы для грамадзян усіх краін Еўрасаюза.

Такім чынам, Арменія далучылася да групы 120 краін, куды палякі могуць уязджаць без дадатковых дазволаў. У гэтай групе апынулася большасць еўрапейскіх краін, Канада, Ізраіль, Японія.

Палякам па-ранейшаму патрэбны візы ў больш як 80 краін, уключаючы Расію, Беларусь і ЗША.

Нелегалы ў казачным пекле

Улады Аб’яднаных Арабскіх Эміратаў аб’явілі амністыю для нелегалаў.

Аднак гэта вельмі сціплы падарунак для людзей, якія дзясяткі гадоў нявольніцкай працай будуюць шэйхам ашаламляльнае багацце, піша польская Gazeta Wyborcza.

62-гадовы пакістанец Нур Мухамед прыехаў у Абу Забі, калі яму было 20 гадоў. На радзіму ён паедзе ў ліку тысячы нелегалаў, якія скарыстаюцца амністыяй. За кожны дзень нелегальнага пражывання іншаземец мусіць заплаціць 7 долараў штрафу. Амністыя дазваляе выехаць, не заплаціўшы штраф.

У Арабскіх Эміратах працуе звыш дзесяці мільёнаў імігрантаў з бедных краін, галоўным чынам з Паўднёвай Азіі. Яны жывуць у трушчобах у жахлівых бытавых умовах. Працуюць 7 дзён у тыдзень па 18 гадзін. Зарабляюць некалькі сотняў долараў. Многія з іх кожны дзень рызыкуюць жыццём. Працуюць на вялікай вышыні ў 50-градуснай гарачыні.

Вельмі проста згубіць дазвол на працу і стаць нелегалам. Імігрант атрымлівае візу на падставе запрашэння ад канкрэтнага працадаўцы. А ён можа ў любы момант адмовіцца. Тады іншаземец робіцца нелегалам.

